Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 70 к.
„ 3 „	2 р. — к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок капярэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок капярэлі паперод тэксту 1 р. — к.
За радок капярэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. даражэй.
Зьніж тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў ніжэйшых газэты, ва ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 3 (2191) Серада, 4-га студзеня 1928 г.

АБ СПРАВАЗДАЧАХ САВЕТАЎ ВЫБАРШЧЫКАМ.

Ужо адзначалася, што адным з найважнейшых момантаў у падрыхтоўчаперавыбарчай кампаніі саветаў зьяўляецца арганізацыя справаздачнасьці саветаў перад выбаршчыкамі. Наперад можна сказаць, што актыўнасьць выбаршчыкаў на перавыбарах саветаў цалкам залежыць ад якасьці справаздачнай і падрыхтоўчай кампаніі.

Перш за ўсё трэба адзначыць агульнае палажэньне саветаў, якія альтыцыяўляюць, пад кіраўніцтвам партыі, сацыялістычнае будаўніцтва, залучаючы ў гэтае будаўніцтва гарадзкі пралетарыят і шырокія масы сялянскага і местачковага актыву.

Задачы, якія выцякаюць з лёзунгу ажыўленьня саветаў: замацаваньне кіраўнічай ролі з боку пралетарыяту і беднаты ў саветах, у іх масавай і практычнай працы; палепшаньне савецкага апарату ў цэнтры і на мясцох, яго патананьне і абнаўленьне; згуртаваньне навокал саветаў шырокага беспартыйнага актыву з рабочых, батрацтва, жанчын, беднякоў і сераднякоў—у значнай частцы выкананы.

Роля саветаў, як кіраўнікоў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва на мясцох, значна павялічылася: яны ня толькі сталі лепш выконваць загады, але і самі праяўляюць ініцыятыву. Масавая работа саветаў праз сэкцыі, камісіі і пленумы і кіраўніцтва сходамі, у параўнаньні з мінулым годам, пашырылася і арганізацыйна замацоўваецца. Справаздачная кампанія павінна паказаць добрыя вынікі і адмоўныя бакі працы саветаў.

На мінулагодніх выбарчых сходах па практычных пытаньнях савецкага будаўніцтва, саветы атрымалі ад выбаршчыкаў наказы,—як дырэктыву—плян гадавой працы. Справаздача кожнага дэпутата аб дзейнасьці савету павінна даць поўны адказ на тое, што зроблена ім, дэпутатам і саветам наогул, у напрамку выкананьня дырэктывы наказу.

Кожны выбаршчык заінтарасаваны ў тым, каб з гадовае справаздачы даведацца аб сапраўднай рабоце савету ў справах эканамічнага і культурна-сацыяльнага развіцьця.

Тут трэба ўспомніць аб недахопах справаздачнай кампаніі леташняга года з тым, каб не рабіць памылак у гэтым годзе. Галоўнымі недахопамі ў справаздачнай кампаніі 1926 г. трэба лічыць:

1. Недастатковае залучэньне на справаздачныя сходы батрацтва, беднаты і жанчын; гэты недахон зьяўляўся вынікам таго, што к справаздачнаму сходу ў многіх мясцох ня рыхтаваўся цьвёрда дзень і час сходу; выбаршчыкі абвяшчаліся за 2-3 гадзіны да сходу, будынак загадзя не падрыхтоўваўся; былі выпадкі, калі сход не збіраўся, а дакладчык ня прыходзіў; з гэтае прычыны нанова склікаліся сходы па некалькі разоў.

2. У шмат мясцох на абвестку дню справаздачнага сходу ў першую чаргу ставіліся справаздачы: райвыканкому, каапэрацыі, камітэту ўзаемадапамогі і г. д., прычым часта бывала, што справаздача савету абгаварвалася трэцім альбо чацьвертым пытаньнем.

3. Справаздача савету будавалася так, што яе зьмест ня можа зацікавіць выбаршчыкаў: дакладчык у лічбах адзначаў колькасьць насельніцтва, гаспадарак, ворнай і няворнай зямлі, сенажаці, коняй, кароў, гусей і г. д., але ці зусім нічога не гаворачы аб тым, што і як на працягу году рабілася саветам,—як выкананы наказ.

4. Культурна-асьветныя ўстановы: клюбы, нарадамы, хаты-чытальні, чырвоныя куткі і нават насьценныя газэты, параўнаўча, слаба прымалі ўдзел у падрыхтоўцы грамадзкай думкі да справаздачнае кампаніі і г. д.

Праводзячы падрыхтоўку, кожны савет павінен у першую чаргу зьнічыць памылкі і недахопы мінулага; гэтае перашкоды пры правядзеньні справаздачнасьці павінны быць заранее прадугледжаны.

Максымум увагі стварэньню ўмоў, якія найлепш забясьпечаць актыўнасьць выбаршчыкаў на справаздачных сходах.

Трэба ўвесьці такі парадак, каб ва ўсіх мясцох справаздача сельсавету на справаздачным сходзе была галоўнай і ставарвалася першай; каб райвыканком рабіў сваю справаздачу пасьля савету, астанаўліваючыся ў большасьці з высьвятленьні тых момантаў работы, якія больш зацікавілі выбаршчыкаў і ня досыць высьветлены справаздачай савету. Справаздачы ні ў якім выпадку не павінны займаць больш гадзіны—40-45 хвілін.

Справаздача савету да вынясеньня на агульныя сходы павінна быць прапрацована калектыўна камісіямі, прэзыдыумам і пленумам, памятаючы, што кожны член савету адказвае за працу ўсяго савету, а савет у цэлым павінен быць адказным за дзейнасьць і справаздачнасьць кожнага дэпутата.

Ад упаўнаважаных, якія прымацаваны да сельсавету на час перавыбараў, патрабуецца максымум дапамогі саветам у іх справаздачнасьці. Трэба поўнасьцю забясьпечыць самакрытыку і дзелавую крытыку дакладаў.

Вязумоўна, што ў аснову справаздачнасьці нележыць пакласьці данныя аб выкананьні саветам наказу і ажыцьцяўленьня пастаноў райённага вязду саветаў і вышэйшых органаў улады.

Самы парадак справаздачнасьці, мне здаецца, трэба пабудаваць, прытрымліваючыся зьместу наказу з падзелам асобных частак работы савету па асноўных галінах савецкага будаўніцтва: арганізацыйна-адміністрацыйнай, гаспадарча-эканамічнай і культурна-сацыяльнай.

У першай частцы справаздачы павінна быць дадзена характарыстыка таго, як ажыцьцяўлялася масавая і агульна-дзелавая праца савету. Гэта значыць, што тут павінна быць высьветлена, наколькі савет у сваёй штодзённай рабоце быў зьвязан з прапоўнымі масамі, як ён абслугоўваў агульныя іх запатрабаваньні, як праводзілася дапамога беднаце, яе роля ў савецка-грамадзкай праны ў райёне савету; у чым заключалася сувязь савету з актывам і грамадзкімі арганізацыямі і што ім (саветам) зроблена для іх развіцьця і ўзмацненьня, аб тым як савет кіраваў сходамі насельніцтва і дапамагаў вырашаць грамадзкія справы.

Трэба высьветліць, у чым выявілася дзейнасьць савету па ажыцьцяўленьні палітыкі савецкай улады, пастаноў вышэйшых савецкіх органаў і зьездаў; якія мерапрыемствы праведзены саветам па растлумачэньні насельніцтву важнейшых законаў ураду, як праводзілася сувязь савету з вышэйстаячымі органамі; колькі і якія пытаньні ўзьняты саветам па сваёй ініцыятыве перад райёнам ці акругай, як вырашаны гэтыя пытаньні.

Трэба сказаць, што канкрэтна зроблена ў справе барацьбы з хуліганствам, самагонакурэньнем, як видзецца нагляд з боку савету за выконваньнем насельніцтвам абавязковых пастаноў, як працуюць сельскія выканаўцы.

У частцы гаспадарчай дзейнасьці савету павінны быць высьветлены работы па падняцьню эканамічнага дабрабыту данага савету наогул і сельскае гаспадаркі ў прыватнасьці, правільна характарызуючы лічбамі і фактамі яго рост і напрамак.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на высьвятленьне пытаньняў: становішча землябудаўніцтва, мэліярацыі, становішча калектываў, арцелаў, забясьпечаньня бяднейшага насельніцтва прыладамі, насеньнем, аграпамічная дапамога, каапэрацыя, крэдыт, агнятрывалае будаўніцтва і г. д.

Разам з гэтым трэба высьветліць выбаршчыкам становішча прамысловасьці (дзяржаўнай, каапэрацыйнай, саматужніцкай і прыватнай) і магчымасьці далейшага яе развіцьця і мерапрыемстваў савету ў гэтым напрамку. Неабходна дакладна высьветліць работу савету ў галіне паляпшаньня становішча мастоў, шляхаў, студняў, пажарнай аховы і г. д.

Пытаньні падаткаў і бюджэту павінна заняць таксама значнае месца ў дакладзе: удзел савету ў пабудаваньні райённага каштарысу; крыніцы прыбыткаў і магчымасьці іх павялічэньня, ступень забясьпечанасьці каштарысными сродкамі ўстаноў савету.

Трэцяя асноўная галіна работы савету—культурна-сацыяльная. У гэтай галіне работы савету неабходна высьветліць становішча школ, колькасны абхоп імі дзяцей школьнага ўзросту наогул і беднаты ў прыватнасьці. Зьнічэньне нянісьменнасьці сярод дарослых, работа хат-чытальнь, становішча больніцы, лекавых участкаў, барацьба з віндзьмарствам, палепшаньне быту.

Вось тыя галоўныя моманты справаздачнай кампаніі і прыкладны парадак у яе правядзеньні.

Неабходна яшчэ раз падкрэсьліць, што ўсе галіны работы савету павінны асьвятляцца дакладчыкамі з пункту погляду выпаўненьня наказу выбаршчыкаў і пастаноў вышэйшых савецкіх органаў.

А. ХАЦКЕВІЧ.

НЯСТРЫМНЫ НАСТУП АЎСТРЫЙСКАГА ФАШЫЗМУ.

ВЕНА, 2-I. Орган аўстрыйскае партыі «Рота-Фане» сьцьвярджае ў адным артыкуле, што пасьля ліквідацыі падзей аўстрыйскі фашызм значаў наступ, усё больш няўстрымна па меры таго, як сацыял-дэмакратыя капітулюе і пікчэмным выкляканьнем спрабуе схіліць буржуазею да заснаваньня кааліцыйнага ўраду. „1928 год—гаворыцца ў артыкуле—будзе годам перамогі аўстрыйскага пралетарыяту, калі ён канчаткова пераможа дэмакратычныя мары і аб'яднаецца пад сьцягам кампартыі».

Прароцтвы меншавікоў на сваю галаву.

ВЕНА, 2-I. У зьвязку з новым годам сацыял-дэмакратычная партыя Аўстрыі пачалася да сваіх прыхільнікаў, у якім зазначаецца, што ў адносінах 1928 год для Эўропы пачнецца ваенным ліхаманкам. Ня ўлева. У лісьце падкрэсьліваюцца заслугі венскага краявога парламенту ў тым ліку гарантыйны крэдыт, нададзены з мэтаю дапамогі вывазу ў СССР, і пералічваюцца бліжэйшыя задачы партыі.

ЯК ІМПЭРЫЯЛІСТЫ „ЦЫВІЛІЗУЮЦЬ" КАЛЁНІІ.

БЕЛЫ ТЭРОР У ІНДАНЭЗІІ.

АМСТЭРДАМ, 27-XII. Як паведамляе афіцыйнае галяндзкае агенцтва «Анэта», генэрал-губернатар Інданэзіі адхіліў хадайніцтва аб памілаваньні трох удзельнікаў паўстаньня ў Сэлюнгканзе, засуджаных да пакараньня сьмерцю. Адначасна адхілена хадайніцтва аб памілаваньні яшчэ трох удзельнікаў паўстаньня, з якіх адзін засуджан да зьняволеньня ў астрозе на ўсё жыцьцё, а два іншыя—на 20 гадоў.

Сэлюнгканг—цэнтр паўстаньня на Суматры ў пачатку 1927 г., у якім брала ўдзел пагалоўна ўсё тубыльскае жыхарства.

Камуністычны дэпутат галяндзкага парламату дэ-Вісэр падаў у парламант прапанову забараніць фізычныя кары ў Інданэзіі, якія ўжываюцца да гэтага часу ў астрогах і на дзяржаўных прадпрыемствах у адносінах да тубыльцаў. Прапанова дэ-Вісэра была падтрымана толькі адным сацыял-дэмакратычным дэпутатам Крамэрам. Большасьць парламанту, разам з якім галасавалі ўсе іншыя сацыял-дэмакраты, выказалася нават проці таго, каб паставіць прапанову дэ-Вісэра на абмеркаваньне.

Растрэлы ў францускай Сірыі.

АНГОРА, 22-XII. У Дамаску за апошнія дні было пакарана сьмерцю некалькі чалавек, якія бралі ўдзел у паўстанцкім руху. У Бэйруце публічна пакараны сьмерцю друз рабочы Алі Фахр, які браў у 25 годзе ўдзел у паступе друзаў на Рашэджу. Алі Фахр быў выдадзен францускай уладзе палестынскім урадам.

У мясцох зьняволеньня і ў высылцы паранейшаму знаходзяцца сотні і тысячы сірыйскіх нацыяналістаў. Агітацыя за амністыю знаходзіць водгук ва ўсіх без выключэньня колах жыхарства настолькі, што ў некаторых мясцовасьцях француская ўлада баіцца новых непарадкаў.

Ісьляндыя ў палоне ангельскіх нафтавікоў.

БЭРЛІН, 2-I. Паведамляюць, што з прычыны буйнага стратэгічнага значэньня Ісьляндыі ангельскія нафтавыя таварыствы арганізуюць там нафтавыя станцыі, ёмкасьць якіх больш чым у два разы перавышае гадовую патрэбу газы на гэтай дацкай выспе. Мясцовае жыхарства з трывогаю сачыць за пабудоваю гэтых станцый, памятаючы гады сусьветнае вайны, калі ангельскі камісар па правядзеньні блёкады Кэль самаўласна рэгуляваў цэны і ўжываньне нафты на выспе.

ЛЁКАУТ 21.000 ШВЭДЗКІХ РАБОЧЫХ.

СТАКГОЛЬМ, 2-I. Перамовы між рабочымі і ўласьнікамі прадпрыемстваў па выпрацоўцы драўніннае масы адносна згоды аб заработку не далі ніякіх вынікаў. З гэтае прычыны, сёньня на прадпрыемствах па выпрацоўцы драўніннае масы пачынаецца лёкаут.

Сёньня абвешчан лёкаут на 40 невялікіх жалезных капальнях, між рабочымі і ўласьнікамі якіх таксама не дасягнута згода па пытаньні аб заработку. Агульны лік ахопленых лёкаутам рабочых дасягае 21 тысячы.

МАГЧЫМЫ ПЕРАГЛЯД ПЛЯНУ ДАУЭСА.

ПРАЗКТ ЗЬМЯНШЭНЬНЯ НЯМЕЦКАГА РЭПАРАЦЫЙНАГА ДОЎГУ.

БЭРЛІН, 2-I. Насупроць афіцыйных адхіленьняў з амэрыканскага боку, зробленых у апошнія дні, «Дэйтшэ Бэргвэрк Цэйтунг» (орган нямецкае цяжкае прамысловасьці) паведамляе, спасылаючыся на пэўныя крыніцы: «Чуткі аб надыходзячым перагляде пляну Дауэса маюць вельмі рэальную падставу і грунтуюцца на сур'ёзных прапановах амэрыканскіх банкіраў.

Згодна гэтых прапаноў, рэпарацыйная праблема павінна быць вырашана ў адпаведнасьці з міжнароднаю запазычанасьцю Злучаным Штатам: замест 2 міліярдаў даляраў міжсаюзьніцкіх даўгоў Амэрыка павінна будзе атрымаць 4 міліярды 250 міліёнаў даляраў ад Нямеччыны. Пры дапамозе міжнароднага банкаўскага кансорцыуму і зацікаўленых урадаў у гэтым выпадку павінна быць выпушчана пазыка ў 6 міліярдаў даляраў—4 міліярды 250 міліёнаў Злучаным Штатам, паўтары міліярды на стабілізацыю эўранейскіх валют і 250 міліёнаў даляраў на выкуп пазыкі, нададзенай Нямеччыне па пляне Дауэса—з 5 з паловаю процантаў гадавых і аднаго з паловаю процанту на пагашэньне асноўнае сумы пазыкі, якія павінна будзе выплачваць Нямеччына.

Такім парадкам, рэпарацыйны доўг Нямеччыны будзе складаць замест 132 міліярдаў марак толькі 6 міліярдаў даляраў з гадавымі ўзносамі ў разьмеры 420 міліёнаў даляраў".

БОМБЫ У КАЗАРМЫ ЧАНКАЙШЫСТАЎ.

Шанхай на ваенным становішчы.

ШАНХАЙ, 2-I. 30 сьнежня ўвечары ў кітайскім горадзе Шанхая Чапэй былі кінуты дзве бомбы каля казарм 61 палка. У зьвязку з гэтым, на ўсёй кітайскай тэрыторыі Шанхаю абвешчана ваеннае становішча. Кітайскі друк прыпісвае выбух бомб камуністам.

РАСЕЙСКІЯ ЧОРНАСОТЕНЦЫ—ДАРАДЧЫКІ ЧАНКАЙШЫСТАЎ.

ПЕКІН, 2-I. Тэлеграфнае агенцтва „Азіятык Ньюс" паведамляе, што генэрал Чэн-Тао ў Ханькоу назначыў быўшага царскага консула Білушэнку сваім палітычным дарадчыкам.

КАТ У АДСТАЎЦЫ.

ТОКІЁ, 2-I. Водлуг надасланых сюды вёстак, генерал Лі-Фу-Лін прыехаў з Кантону ў Ганконг, дзе агаласіў заяву аб сваёй адстаўцы.

НЯМЕЦКАЯ ЗБРОЯ Ў ПАЎНОЧНЦАЎ.

ПЕКІН, 2-I. Паведамляюць, што ў Цынцао (порт у правінцыі Шандунь) рэквізавана [illegible] чыгуначных вагонаў для перавозкі зброі і амуніцыі, прыбыўшых з Нямеччыны для Сун-Чуан-Фана. Прыбыўшая зброя і амуніцыя перавозяцца ў Цзінань (сталіца Шандуньскай правінцыі).

ТАВ. ПАХВАЛІНСКІ ЗАНЯДУЖАЎ.

Супрацоўнікі кантонскага консульства выяжджаюць у СССР.

ШАНХАЙ, 31-XII. Як паведамляе тэлеграма Рэйтэра з Ганконгу, пасьля прыезду Пахвалінскага ў Ганконг ён і яго падарожнікі выяжджаюць у Шанхай на параходзе „Суйюань" 1-га студзеня. Калі ў Шанхаі ім не дазволяць высадзіцца, дык яны паедуць на Кобэ.

Тэлеграма дадае, што Пахвалінскі захварэў.

КАНТРАБАНДНАЯ ЗБРОЯ З ІТАЛІІ Ў АЎСТРЫЮ.

ВЭНА, 2-I. Газэта «Морген» паведамляе, што ўчора ўдзень на прыгранічную аўстра-вэнгерскую станцыю Сангадарт (у Штырыі) прывезена 5 вагонаў з кулямётамі, якія накіроўваюцца з Італіі. У аўстрыйскай мытніцы на кулямёты была пададзена фальшывая накладная на «машынныя часткі». Раней, чыяся аўстрыйская мытная ўлада здолела выявіць сапраўдны характар грузу, вэнгерскія чыгуначнікі паставілі да вагонаў, якія былі на вэнгерскай каляіне, вайсковую варту, якая сілаю перашкодзіла намеру аўстрыйскае мытнае ўлады накіраваць вагоны назад у Аўстрыю.

У знак пратэсту проці ўчынкаў вэнгерскае ўлады служачыя аўстрыйскае мытніцы пакінулі Сангадарт. Таварны рух па гэтай каляіне спынен. Пасажырскі рух адбываецца далей.

БАРАЦЬБА ЗА АМНІСТЫЮ ПАЛІТВЯЗЬНЯМ У БАЎГАРЫІ.

ВЕНА, 30-XII. Як паведамляюць з Сафіі, у сьпіс вязьняў, амніставаных каралём у зьвязку з калядамі, было ўпісана некалькі палітычных. Аднак, усе яны падалі калектыўную заяву міністру юстыцыі з адмоваю ад дараваньня віны, зазначаючы, што выйдуць з астрогу толькі на аснове агульнае і безгаворачнае амністыі ўсім вязьням.

Заява палітычных зрабіла на ўсіх колах Баўгарыі вялічэзнае ўражаньне. Нарада парляманцкіх фракцый рабочае партыі, сялянскага саюзу, сацыял-дэмакратаў і партыі дробных рамесьнікоў ухваліла зьвярнуцца да прэм'ера, чаму да гэтага часу ўрад не падаў у парлямант заканапраекту аб амністыі.

У Сафіі на супольнай нарадзе прадстаўнікоў лігі правоў чалавека, жаночага саюзу, незалежных прафсаюзаў Баўгарыі, саюзу сялянскае моладзі, саюзу сацыял-дэмакратычнае моладзі і сацыял-дэмакратычнае партыі створан «камітэт па барацьбе за амністыю».

РЭПРЭСІІ ЗА ПРАЎДУ АБ СССР.

ВЕНА, 30-XII. Як паведамляюць з Сафіі, пракуратура прыцягнула рэдактара рабочае газэты «Навіны» да адказнасьці за артыкул у адным з верасьнёўскіх нумароў газэты аб савецкім павільёне на венскім міжнародным кірмашы. Аўтар гэтага артыкулу, спыняючыся на экспанатах у савецкім павільёне, зазначаў на вялічэзнае прыроднае багацьце і прагрэс сацыялістычнага будаўніцтва СССР і заклікаў да актыўнага падтрыманьня СССР і выступленьня проці ў падрыхтоўцы імпэрыялістычнае вайны.

Кастрычнікавы прызыў шведзкае кампартыі.

СТАКГОЛЬМ, 25-XII. Шведзкая камуністычная партыя правяла сваю кампанію ў сувязі з 10-цігодзьдзем Кастрычнікавае рэвалюцыі з вялікім посьпехам. За час кампаніі было праведзена каля 260 рэвалюцыйных сьвят, на якіх перабывала да 55 тысяч удзельнікаў. У арганізацыі сьвят побач з кампаньяй брала ўдзел каля 20 прафэсыянальных арганізацый. За час кампаніі заснавана 11 мясцовых партыйных арганізацый з 700 новымі членамі, а таксама некалькі новых вытворчых і вясковых ячэек.

Фашысцкі тэрор у Польшчы.

РАЗГОН СХОДУ.

У мінулую сераду на тутунёвай фабрыцы пры вул. Макавай у Вільні адбыўся, як піша „Дз. Віл.", сход моладзі па пытаньні аб сваіх прафсаюзных справах. Сход быў разагнаны паліцыяй.

АРЫШТЫ.

У Ейскай вол., Сакольскага пав., палітычная паліцыя арыштавала шэраг асоб па абвінавачаньні ў антыдзяржаўнай і прадвыбарнай дзейнасьці.

Усіх арыштаваных пасадзілі ў астрог.

ВОБЫСК У КВАТЭРЫ ВАЯВУДЗКАГА.

ВАРШАВА, 30-XII. На кватэры ранейшага дэпутата незалежнае сялянскае партыі Ваявудзкага ўчынен вобыск. Газэты паведамляюць, што паліцыя канфіскавала ў Ваявудзкага ўсё выданьне перадвыбарчае пляцформы сялянскага саюзу «Піла».

Польскі сельсаюз „працуе".

У працягу сьнежня польскі сельсаюз зрабіў некалькі зьездаў на беларускіх абшарах. Зьезды адбыліся у Ваўкавыску, Сакольцы, Беластоку. У студзені адбудзецца зьезд у Горадні.

ПОЛЬШЧА ПЕРАД НОВЫМІ ВЫБАРАМІ.

І Валэйша хоча быць паслом...

Вядомы на віленскім грунце сваімі авантурніцкімі дэфэнзыўна-шпікоўскімі спосабамі працы сярод беларускага грамадзянства пан Браніслаў Валэйша выдаў адозву, у якой заклікае «беларускі народ, каб ён намог яму памірыць беларускіх дзеячоў». Трэба дзівіцца, што такі скампрамітаваны палітычна чалавек бярэцца за якуюсь-ці „місію прымірэньня",—хіба-што з даручэньня польскай дэфэнзывы, якая ідзе на ўсе сродкі, абы толькі скампрамітаваць беларускі рух.

Міткевіч і той лезе.

Вядомы польскі дэфэнзыўшчык, які разам з бандай «генэрала» Балаховіча ў часе выбараў у сойм у 1922 г. прыкладаў усе высілкі, каб перашкодзіць беларусам выбраць у сойм не запраданых у той час дэфэнзыве людзей, распачаў ізноў сваю дэфэнзыўную акцыю і мае намер выступіць на выбарах з сваім уласным сьпіскам кандыдатаў, ня блёкуючыся ні з водным беларускім сьпіскам.

Блёк Пяста і хадэцыі.

Як паведамляе „Роботнік", блёк Пяста і хадэцыі ўжо канчаткова склаўся. Уложан супольны сьпіс кандыдатаў у некаторых акругах.

Эндэкі ў гэты блёк не ўваходзяць.

Сярод яўрэйскіх партый.

Група сыяністаў кірунку Грынбаума на рэпрэзэнтуе ўсяе мяшчанскае клясы яўрэяў. Частка сыяністаў і значная большасьць артадоксаў ня хоча ісьці да блёку нацменшасьцяў.

Ня выключана магчымасьць сацыялістычнага блёку Бунду і Паалей-Сыёну.

Б. пасол Галка.

Б. пасол Галка, які быў адным з дзейных сяброў вядомай ашуканскай партыі «Вызваленьне», а потым перайшоў у «Краёвае аб'яднаньне», робіць цяпер высілкі аб атрыманьні ад новай сваёй арганізацыі мандату на Новагрудзкае паводзьцо для правядзеньня там агітацыйнай акцыі.

Б. пасол Шапэль.

Б. пасол Шапэль, адзін з правадыроў Радыкальнай Сялянскай Партыі Беларускіх Зямель, склікае на 15-га студзеня 1928 г. зьезд сяброў сваёй партыі.

Паліцыя і пэпээсы.

«Роботнік» (№ 353, 1927 г.) падае малюнак перадвыбарнага сходу, які мець адбыцца ў вёсцы Засьцепак, Ляхавіцкай вол., Лунінецкага пав. На сход павінны былі прыбыць асобы, якія пражываюць ад данай мясцовасьці ў адлегласьці аж 40 клм. На сход зьявілася каля 50 асоб з некаторым спазьненьнем. Паліцыянт не дазволіў з гэтай прычыны сходу.

Міністр выступіў з «Вызваленьня».

31 сьнежня 1927 г. міністр пошты і тэлеграфу п. Медзінскі паведаміў галоўную ўправу партыі «Вызваленьне» аб сваім выступленьні з гэтай партыі.

Папоўскія «Народная Ніва» і «Трэзвон».

Як паведамляе Віл. манархіскае „Слово", у кіткім часе пачнуць выходзіць дзве новыя папоўскія часопісі: «Народная Ніва»—орган праваслаўнага выбарнага к-ту, зарганізаванага пад правадырствам мітрапаліта Дзяніса, і «Трэзвон», які будзе друкавацца на трох мовах—расейскай, украінскай і беларускай. Рэдактарам першай будзе вядомы ў Менску Д. Бохан, а другой—яшчэ не вядома.

157 банкруцтваў.

У працягу мінулага году ў Польшчы збанкрутавала 152 гандлёва-прамысловыя фірмы, г. ё. гандлёвых прадпрыемстваў—110, прамысловых—4 і адно крэдытнае.

Пакража ў касьцёле.

У канцы сьнежня мінулага году злодзей абакраў у Варшаве касьцёл сьв. Яна. Касьцёл гэты зьяўляецца адным з старэйшых і багацейшых у Варшаве. Злодзеі ўвайшлі ў касьцёл пры помачы падробленых ключоў, бо ўсе дзьверы аказаліся цэлымі. Кантроўнасьць аграбленага яшчэ не ацэнена.

Мамонька пабіў Ярэміча.

Віленскае „Слово" (№ 297) паведамляе, што ў памяшканьні Інстытуту гаспадаркі і культуры" (Вільня, Вострабрамскае, 9) дайшло да рукапрыкладстваў між Мамонькай і б. паслом Ярэмічам. Мамонька ударыў Ярэміча кулаком. Прыкрае гэта здарэньне зьяўляецца цяпер прадметам размоў у віленскіх палітычных сфэрах.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

ЗАТРЫМАНЫЯ Ў ВЭНГРЫІ КУЛЯМЁТЫ НАКІРОЎВАЛІСЯ С ІТАЛІІ Ў ВАРШАВУ.

ПАРЫЖ, 3-I. Агэнцтва Гаваса паведамляе, што па вестках вэнгерскага тэлеграфнага агэнцтва прыбыўшыя на вэнгерскую граніцу з Італіі вагоны з кулямётнымі часткамі накіроўваліся ў Варшаву. Вэнгерская таможня затрымала гэты груз.

РАЗБРОЕНЬНЕ ВОЙСКА БАЙ-ЦЗУН-ЧЫ.

ТОКІЁ, 3-I. Чан-Кай-Шы разброіў войска Бай-Цзун-Чы, якое знаходзілася ў Шанхаі. У Шанхаі абвешчана ваеннае становішча. Неабходнасьць гэтага ўчынку афіцыйна тлумачыцца «пагрозай камуністычнага паўстаньня».

БОЙКІ МІЖ ГУАНДУНСКІМІ І ГУАНСІЙСКІМІ ВОЙСКАМІ.

НЬЮ-ЁРК, 3-I. Па паведамленьню з Кантону, барацьба між гуандунскімі (Чан-Фа-Гуй) і гуансійскімі войскамі (на чале іх стаіць прыхільнік Лі-Ці-Сіна—Хуан-Сяо-Сян) аднавіліся. Бойкі адбываюцца ў Шэктане (у 80 кілёмэтрах к усходу ад Кантону).

ПРАЦЭС ГРУПЫ ФІНСКІХ ШПІЁНАЎ.

ЛЕНІНГРАД, 3-I. Пачалася справа групы фінскіх шпіёнаў. Цэнтральнай фігурай працэсу зьяўляецца Паукку. Усяго па справе прыцягнута 15 чал.

За дзень.

Каралеўская амністыя.

Баўгарскі король абвясьціў амністыю зьняволеным. Зусім зразумела, што ў краіне разьюшанага фашызму, як Баўгарыя, вызваліць з астрогаў палітычных зьняволеных—рэч занадта немагчымая. Тым больш, гэткі выпадак немагчымы ў адносіне да камуністаў і рабочых, якія вось ужо колькі гадоў упарта змагаюцца з валюнічым баўгарскім фашызмам, які паўтарае найгоршыя зьдзекі свайго старэйшага сабрата—фашызму італьянскага.

Таму ніхто, зразумела, і не падумаў, што пад амністыю караля таксама падпадуць зьняволеныя рабочыя. Баўгарская камуністычная партыя і лібэральныя грамадзкія арганізацыі Баўгарыі вядуць кампанію за агульную амністыю, за вызваленьне ўсіх палітычных зьняволеных. Гэткага роду кампанія таксама вядзецца і ў іншых буржуазных краінах, але да гэтага часу ніякіх пэўных вынікаў няма. Наш чытач памятае пра нямецкую амністыю кастрычніка 1927 г., абвешчаную Гіндэнбургам. Дарма мы чакалі вызваленьня Макса Гельца і інш. пралетарскіх лідэраў. Гэтая амністыя вызваліла з астрогу толькі манархістаў, фашыстаў і казнакрадаў. Гіндэнбурдаўская амністыя ў свой час выклікала вялікае абурэньне працоўных мас усіх краін. Гэты гіндэнбурдаўскі вопыт добра памятаў баўгарскі король пры абвяшчэньні амністыі і таму ў лік асоб, якія павінны былі быць вызваленымі, таксама трапілі і некаторыя палітычныя вязьні.

Дарма баўгарскі фашызм разьлічваў гэтым узьняць патрыётычны настрой працоўных мас Баўгарыі. Дарма баўгарскі король спадзяваўся на палепшаньне адносін пасьльніцтва да яго. Тыя палітычныя вязьні, якія падлягалі вызваленьню, адмовіліся яго пакінуць. Яны казалі, што пакінуць яго толькі ў тым выпадку, калі будуць вызваленыя іх таварышы, г. зн. усе палітычныя зьняволеньня ва ўсіх астрогах Баўгарыі. Сапраўдны рэвалюцыянэр барацьбіт ставіць інтарэсы агульнага характару вышэй сваіх уласных. Гэта яскрава даказалі баўгарскія таварышы.

Лепшым адказам працоўных мас Баўгарыі на гэта будзе яшчэ большае разгортваньне барацьбы за агульную амністыю, далейшы наступ на баўгарскі фашызм, які прымушан будзе адступіць перад наступам усіх працоўных мас.

„Пяцігодка" сусьветнага імпэрыялізму.

Будучы гісторык, як будзе апісваць жыцьцё чалавецтва ў мінулым 1927 г., не абміне маўчальнем тое вялікае напружаньне, з якім і малыя і вялікія імпэрыялісты працавалі над павялічэньнем узброеньня на сушы, на моры і ў паветры. Як паглядзім спаборніцтвы вялікіх імпэрыялістычных дзяржаў у справе ўзброеньня, дык яно сапраўды нас ня можа ня зьдзівіць.

У плян працы ў бліжэйшыя пяць гадоў Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты вызначылі пабудову: 4-х лінейных караблёў, 26-ці крэйсэраў, 3 авіяносцаў, 32 сумбарынь і 18-ці эскадронных торпэданосцаў.

Выдаткі на іх пабудову складаюць больш 1000000000 р.

Нават буржуазна-рэакцыйны друк разглядае гэтую пяцігодку, як пагрозу для сусьветнага спакою. Італьянская газэта «Пополе д'Італія» піша: «Амэрыка хоча пабудаваць «вялікую армаду» і выкарыстаць Панамскі і Нікаруагуанскі каналы, каб перакідаць у працягу 14 гадзін галоўныя сілы свайго ціхаамэрыканскага флёту ў Атлянтычны акіян. Гэткім мэтадам можа быць паралізаваны напад на Амэрыку з боку Японіі і Англіі.»

Ня лепш справа абстаіць і ў Англіі. Будаўнічая праграма зацьверджаная ангельскім парлямантам, прадугледжвае пабудову ў працягу 5-ці гадоў 79 вайсковых суднаў і аднаго плавучага доку. З гэтага ліку 22 судны ўжо будуюцца.

Згодна заявы першага лёрду адмірэлтэйства вайскова-марскі флёт Англіі зараз складаецца з 395 суднаў, якія маюць 1400 тыс. тон. Сёлета закладзецца яшчэ 1 крэйсэр, 9 торпэданосцаў і 6 сумбарын.

Апроч таго, згодна паведамленьня газэты «Дэйлі Мэйль» у Канадзе ў бліжэйшыя гады будуць закладзены новыя мінаносцы, якія павінны замяніць старыя. Мімаволі праглядаючы гэтую «пяцігодку» мы ніяк ня можам згадзіцца з мірнымі заявамі Чэмбэрленаў, Брыянаў і Куліджаў, якія, падпісваючы адной рукой мірныя дагаворы, другой падпісваюць асигноўкі на марское і інш. роду ўзброеньне.

Трафэі Ярэмічаў і К-о.

28 сьнежня мінулага году ў Вільні адбыўся зьезд дэлегатаў беларускага сялянскага саюзу і беларускай праваслаўнай і каталіцкай хадэцыі. Як паведамляе «Слово» (№ 297), на зьезьдзе было прысутных 105 асоб, у тым ліку прадстаўнікоў ад правінцыі 47; рэшту прадстаўлялі «статысты», запрошаныя, як відаць, для павялічэньня лічбы ўдзельнікаў зьезду і даданьня яму тым большай павагі». Былі прысутнымі б. пасл

Праз 150 гадоў.

У Правансе, урадлівай правінцыі Францыі каралеўства, шырокай славай карыстаўся ў свой час маркіз дэ-Турэ—уладальнік абшарнік і радавіты дваранін. Было гэта даўно, у другой палове XVIII веку, але чорная слава маркіза перажыла яго прах. Праз паўтары сотні гадоў гісторыя гэта была апісана расейскім рэвалюцыянерам-гісторыкам П. Крапоткіным.

У тыя часы сялянне галадалі. 1.200.000 жабраноў і валацугаў—вось афіцыйная лічба, названая ў Вэрсалі. Немалая доля з гэтага ліку прыпадала і на Праванс. Цэлыя пакаленьні сялян сыстэматычна рабаваліся пакаленьнямі маркізаў дэ-Турэ. Замараныя голадам людзі пасівны былі плаціць падаткі нават за права паліць печ, трымаць сабаку. Але надыйшоў неўрадлівы год. Вясною ўсе запасы былі зьнішчаны. І вось, перад вялізным домам маркіза, перад стайнямі, дзе коні елі вазо, аб якім людзі толькі марылі, перад сьвірнамі, поўнымі збожжа, сабраліся сяляне.

Маркіз вышаў на балкон, выслухаў старыкоў, а потым сказаў:

— На лугох вырасла трава. Не чакайце, калуль яе зьесьць жывёла, сьпяшайцеся зьесьці самі.

А ўкопы галодных сялян выгнялі на краю. Дваранкі правёў іх праз бакавую фортку да сажалкі. У маркіза-бацькі, драхлага старыка—мігрэнь. І сяляне ўсю ноч будуць біць кіямі па вадзе, каб прымушаць жаб змоўкнуць.

Багаты пан маркізаў з фантанамі, пачуткамі і іншымі ўпрыгожаньнямі быў адзначаны чыгуннымі кратамі ад лесу. Тут было шмат дзічыны. Вельмі рэдка ў гэтым лесе паляваў сам гаспадар разам ся сваімі прыяцелямі. У іншы час жыцьцё ў ім ішла ахоўвалася лясьнікамі. Калі галодны селянін рабіў замах на забойства жыцьця, дык яго бязьлітасна секлі.

У галодныя гады спробы папаляваць у лесе маркіза асабліва павялічыліся. Людзі вызыкавалі сваёй сьпіной для харчоў. І вось, аднойчы здарыўся такі выпадак.

Разьюшаны маркіз асабіста сам хацеў злавіць злачынцаў. У той-жа дзень лясьнікі злавілі старыка-селяніна і яго 2-х сыноў. Яны забілі труса.

На высокім каштанавым дрэве павесілі гэтых злачынцаў, а труса аддалі сабакам.

* * *

У Лёдзінскім ваяводзтве сучаснае Польшчы „рэспублікі"—рэспублікі без рэспубліканцаў, шырокаю славаю нарыстаецца абшарнік Ясінскі.

Раней пан служыў у маленькім гарадку Вількоміры (Віленскай губэрні). З расейскім начальствам ён жыў вельмі добра і ўцісканў па пэтэрбурскіх дырэктывах аднолькава як літвінаў, так і палякаў. У часе вайны Ясінскі камандваў стралковым палком, а пасьля рэвалюцыі зрабіўся польскім нацыяналам і патрыётам, заслужыўшы такім чынам імя ваяводы ў адной з акругаў Заходняе Беларусі.

Дастасаваўшыся да абставінаў, пан удала „ўрос" у пісудчыну і да моманту перавароту Пі судзкага аказаў нейкія паслугі гэтаму сёньняшняму дыктатару Польшчы.

Летась Ясінскі атрымаў вялікі надзел зямлі з палацам і вышаў у адстаўку. Тут ён заняўся гаспадаркай: рабіў лікёры, разводзіў сабак і страляў глушцоў.

Уваход, паляваньне, зьбіраньне грыбоў і ягад у панскім лесе былі суровa забаронены сялянам вакольчых вёсак. За гэтым пільна сачылі лясьнікі з ранейшых легіянэраў.

У жніўні леташняга году пан ехаў вархом на кані, абружаны сабакамі. Ён заўважыў, як на паляны сялянскі хлапчук вымаў з пасткі труса. Пан вельмі разгневаўся і сьвісьнуў, і цэлая зграя сабак кінулася на хлапчука. Хлапчук пабёг, а сабакі за ім, а ззаду скакаў Ясінскі, махаючы арапнікам.

Сабакі, дагнаўшы хлапчука, перагрызлі яму глотку. Праз некалькі хвілін хлапчук памёр...

Пан Ясінскі ня спыняе і зараз разводзіць сабак і страляць глушцоў.

* * *

У пачатку мы забыліся памянуць пра адну аналічнасьць.

У Правансе паўтары сотні гадоў таму назад каля каштанавага дрэва сабраліся сяляне, тысячы сялян. Яны штурмавалі палац маркіза дэ-Турэ, зьнішчылі яго дашчэнту, гаспадару адсекілі галаву, а цела спалілі разам з рэшткамі палацу.

У памяць трох пакараных сьмерцю сялян гэта месца завецца „Трусовай лагчынай".

І. І.

Развой рэспубліканскага руху ў Юга-Славіі.

ВЕНА, 30-XII. Як паведамляюць з Белграду, у Ягодзіне адбыўся кангрэс рэспубліканскае партыі. Прысутнічала блізка 350 делегатаў. Прамоўцы выказвалі ўпэўненасьць у нядоўгавечнасьці сучаснага рэжыму рэакцыі.

Высокастаўлены растратчык.

ВЕНА, 30-12. У белградзкім судзе скончылася справа ранейшага чыноўніка міністэрства ўнутраных спраў Стэпіча, абвінавачанага ў растрацe 1.600.000 дынараў. Праз Стэпіча сотні тысяч дынараў выдаваліся бяз вінкага кантролю асобным прыяцелям і знаёмым ранейшага міністра ўнутраных спраў Максімовіча, даверанаю асобаю якога зьяўляўся Стэпіч.

Суд прызнаў вадачу 1-го мілёну дынараў правільнаю, а за растрату 600 тысяч дынараў засудзіў Стэпіча на 20 гадоў прымусовае працы.

Падробшчыкі з югаслаўскага аддзяленьня „Стандарт Ойль".

ВЕНА, 2-I. Водлуг паведамленьня з Белграду, сьледчы белградзкага крымінальнага суду ўзбудзіў проці ўсяго складу дырэкцыі і праўленьня югаслаўскага аддзяленьня нафтавага трэсту „Стандарт Ойль" справу на абвінавачаньні ў складаньні фальшывага балянсу. Водлуг данных суду, аддзяленьне «Стандарт Ойль» у Югаславіі паказала ў балянсе павялічэньне акцыянэрнага капіталу на 40 мілёнаў дынар, у той час, як у сапраўднасьці яно вынялася толькі ў 31 мін. дынар. Пры павялічаным акцыянэрным капітале фактычны процант прыбытку, а, значыць, і разьмер бокаў, сьвяшчэнных выплачваецца.

„Стандарт Ойль" падозраюць таксама ў складаньні фальшывага балянсу за 1923-24 г. Абвінавачаныя дырэктары і служачыя „Стандарт Ойль" пакуль-што на волі. У лік членаў праўленьня „Стандарт Ойль" уваходзяць два амэрыканцы—Уокер і Шмідт.

Сьмерць дыпкур'ера Броўна.

ТОКІЁ, 2-I. Сёньня ў Токіё памёр ад атруты газам савецкі дыпляматычны курэр Броўн.

Трансатлянтычны пералёт францускіх авіятараў.

НЬЮ-ЁРК, 1-1. Героі апошняга Трансатлянтычнага пералёту (з Афрыкі ў Паўднёвую Амэрыку) францускія лётчыкі Кост і Лебры знаходзяцца ў сучасны момант у паветраным падарожжы з Буэнос-Айрэсу ў Нью-Ёрк этапамі. На прысьдзе ў Ліму (Пэру) яны абвясьцілі, што зробяць спробу паўторна пераляцець Атлянтычны акіян з Нью-Ёрку ў Парыж.

Весткі адусюль.

Цыганы на зямлю.

ЛЕНІНГРАД, 3-I. У Ленінградзкай вобласьці пачалося земляўпарадкаваньне цыганоў. 400 чалавек ужо атрымала зямлю.

Пагроза разводзьдзя ў Англіі.

ЛЁНДАН, 1-I. Уночы перад новым годам у Лёндане і ў ваколіцах выпаў глыбокі сьнег. Наступіўшая потым адліга і прадугледжваемыя дажджы ствараюць пагрозу разводзьдзя ў шматлікіх мясцох, асабліва ў лагчыне Тэмзы.

Аварыя гідраплану.

ПАРЫЖ, 31-12. У Марсэлі разьбіўся пры спробным палёце новы пасажырскі гідраплян. Забіта 5 пасажыраў.

Фляндрыя пад вадою.

Вялікія абшары францускай Фляндрыі залітыя вадою ад паводкі. На набярэжны шассэ сьнежная павальніца. Загінула некалькі рыбацкіх суднаў. Паезды курсуюць нерэгулярна.

Мора на вуліцах Нэапалю.

У ваколіцы Нэапалю шалее гвалтоўная марская бура. Марскія хвалі зусім зьнішчылі на абшары у 300 мэтраў бульвары Віа Карочыолё і ўварваліся на гарадзкія вуліцы, заліваючы ўсе ніжэй распаложаныя мясцовасьці.

У Саюзных Рэспубліках.

Новы нарком унутраных спраў РСФСР.

МАСКВА. Прэзыдыум Усерасейскага ЦВК назначыў т. Талмачова В. М. Народным Камісарам Унутраных Спраў РСФСР. Гэтая пастанова аб назначэньні т. Талмачова В. М. падаецца на зацьверджаньне чарговае сэсіі Усерасейскага ЦВК.

Выконваючы абавязкі НК Унутраных Спраў т. Ягораў распачынае выкананьне сваіх абавязкаў у якасьці намесьніка Народнага Камісарыяту Ўнутраных Спраў РСФСР.

Т. Талмачоў, член УсеКП(б), па прафэсыі служачы, да назначэньня НК наркомам унутраных спраў быў намесьнікам старшыні Паўночна-Каўкаскага крайвыканкому.

Т. Талмачоў зьяўляецца кандыдатам у члены УсеЦВК.

Новы ўкраінскі закон аб самаабкладзе.

ХАРКАЎ, 3-I. Усеўкраінскім ЦВК і СНК УССР выпрацаван і агалошан новы закон аб самаабкладзе жыхарства для здаволеньня яго культурных патрэб. Галоўнае ў законе наступнае: каб больш поўна здаволіць мясцовыя культурныя і гаспадарчыя патрэбы сельскага жыхарства, дазваляецца ўстанаўляць, па пастанове агульнага сходу грамадзян, самаабклад на такіх асновах: самаабклад дапушчаецца для арганізацыі школьнага і бальнічнага будаўніцтва, абсталяваньня і ўтрыманьня вясковых сацыяльна-культурных устаноў (бібліятэкі, чытальні і інш.), для арганізацыі проціпажарнае аховы, пабудовы і трыманьня ў парадку студняў, грамадзкіх садоў і пляцоў, рамонту сельскіх і палявых шляхаў і розных шляхавых пабудоў. Самаабклад не дапушчаецца на вакрыцьцё выдаткаў сельскае адміністрацыі.

Самаабклад праводзіцца ў грашовай форме, але можа быць заменены натуральным і працоўным удзелам у розпай працы. Пастанова агульнага сходу аб самаабкладзе лічыцца ўхваленаю і абавязковаю для грамадзян усяе вёскі, калі за ўстанаўленьне самаабкладу выказалася большасьць грамадзян, якія ўдзельнічалі ў галасаваньні. Агульны разьмер самаабкладу не павінен перавышаць 35 проц. сельска-гаспадарчага падатку.

Раскладка сум самаабкладу робіцца сельсаветамі з вучотам моцнасьці асобных гаспадарак і з такім разьлікам, каб для больш заможных гаспадарак былі ўстаноўлены больш высокія стаўкі абкладу. Сумы, якія выплачваюцца ў парадку самаабкладу, могуць выдавацца выключна на мэты, зазначаныя ў пастанове агульнага сходу. Выдача памянёных сум на іншыя мэты будзе карацца ў крымінальным парадку.

10-я гадавіна Чырвонае арміі і камсамол.

МАСКВА. ЦК УсеЛКСМ прапанаваў мясцовым арганізацыям правесьці дзесяцігадовы юбілей Чырвонае арміі 23 лютага пад лёзунгам баявога агляду камсамолу, які павінен падагуліць вайсковую працу моладзі і дапамагаць павышэньню якасьці яе ваенізацыі.

Агляд павінен распачацца не пазьней, як за месяц да гадавіны, у працягу якога моладзь павінна азнаёміцца з бытам, працаю і вучобаю Чырвонае арміі.

Растрэл калчакоўскага ахраньніка.

БЛАГАВЕШЧАНСК, 2-I. Выязная сэсія краёвага суду засудзіла да растрэлу калчакоўскага афіцэра Астафурава, які растрэльваў на Амуры сялян і партызан. Астафураў пасьля ліквідацыі Калчака арабіўся сэкратаром вяцкага камгасу, дзе падрабіў дакументы і абрабаваў вяцкі каапэратыў на 10 тысяч руб.

Т-ва па вывучэньні канцавосных краёў.

ЛЕНІНГРАД, 2-1. Адбылося пасяджэньне расейскае групы вучоных—членаў міжнароднага таварыства па вывучэньні канцавосных краёў на дырыжаблі. Абмяркоўвалася шмат пытаньняў, зьвязаных са склікам у Ленінградзе чарговага зьезду таварыства. Першае пасяджэньне зьезду адбудзецца ў Акадэміі Навук 17-га чэрвеня сёлета. З расейскіх вучоных даклады на зьезьдзе зробяць праф. Кміповіч, Біяс, Вараб'ёў, Ахматаў, Розэ і Матусэвіч. Прычальныя мачты для паветраных караблёў мяркуецца пабудаваць у Ленінградзе і ў Мурманску.

На зьезд у Ленінград прыедзе старшыня таварыства Фрытыёф Нансэн.

Новыя нафтавыя залежы.

ТЫФЛІС, 3-I. У Шырацкім стэпу на канцэсіі італа-бальшэйскага акцыянэрнага таварыства пры бурэньні на глыбіні 184 мэтраў спатканы пласты, прасочаныя нафтаю.

На глыбіні 400-600 мэтраў мяркуецца знайсьці багатыя нафтаю пласты.

Маразы ў РСФСР.

НІЖНІ НОЎГАРАД, 2-I. Стаяць моцныя маразы, якія дасягаюць 33-х градусаў. На Казанскай і Разанскай чыгунках з-за марозу і завей паезды вельмі позьняцца.

* * *

СТАЎРОПАЛЬ, 3-I. У акрузе пасьля нясупыннага дажджу трэці дзень круціць сьнежная бура пры марозе ў 25 градусаў. Спыніўся падвоз. Калядныя рынкі з прычыны вялікага марозу не адбыліся.

* * *

ВЯТКА, 3-I. З прычыны 35-цігрaднага марозу позьняцца паезды.

Чаму яны крычаць пра „чырвоны імпэрыялізм".

Каб падрыхтаваць проці СССР ваенны наскок, капіталістычныя дзяржавы праводзяць самую шалёную агітацыю проці нас, узьнімаючы лямант аб «чырвоным імпэрыялізьме» і «бальшавіцкай заразе».

Яшчэ некалькі гадоў назад былы расейскі палкоўнік, а зараз супрацоўнік ангельскага міністэрства замежных спраў, які называе сябе Аўгурам, заявіў, што бальшавікі хочуць стварыць «ланцуг савецкіх рэспублік ад Дунаю і да брамы Індыі».

З таго часу гавэнды аб бальшавіцкай небясьпецы павялічыліся.

Англія больш за ўсё непакоіцца за свае авіяцкія ўладаньні і лямантуе аб пагрозах з боку СССР Індыі і Кітаю.

Успомнім пра нашумеўшае ў свой час выступленьне, улетку 1926 г., начальніка вайсковай разьведкі ў Індыі, палкоўніка Саундэрса. Ён апавядаў розныя нябылицы пра ваенныя падрыхтоўкі бальшавікоў у Аўганістане і ў кітайскім Туркестане. «Гэтае праникненьне,—сказаў Саундэрс,—зьяўляецца сурёзнаю пагрозаю спакою Індыі.

Далей на ўсход, у Кітайскім Туркестане праводзіцца тая-ж палітыка, якая ў выпадку посьпеху прывядзе да таго, што Індыя будзе мець у гарыстай мясцовасьці, сумежнай з ёю границу з бальшавікамі працягам у 8 тысяч міль. Савецкая пагроза Індыі вельмі рэальная»,

Трэба адзначыць таксама выступленьне Магараджы Бабахура з Бэрдвану на адным абедзе 21-га кастрычніка 1927 г.: «Да таго часу,—сказаў ён,—пакуль чырвоная пагроза працягвае свае рукі праз Мангольскую імпэрыю, да таго часу, пакуль чырвонае небясьпека мае намер зруйнаваць фабрыку цывілізацыі, якою зьяўляецца Эўропа, да таго часу Індыя будзе восьсю, на якой павінен быць згуртаваны фокус увагі брытанскіх дзеячоў».

Апошнім цьвіком кампаніі проці чырвонага імпэрыялізму паслужыў савецка-пэрсіцкі ўгавор і чуткі аб назначэньні Барадына вайсковым дарадчыкам пры незалежным мангольскім урадзе. «Манголія,—пісала накоўт гэтага газэта «Дэйлі Мэйль» 8-га лістапада,—трапляе паступова ў рукі бальшавікоў, якія імкнуцца выкарыстаць гэтую заходнюю вобласьць Кітаю ў якасьці базы для сваіх апэрацый у Індыі». Газэты ізноў пярэсьцяць загалоўкамі «Чырвоная небясьпека на Ўсходзе», «Чырвоная знова ў Індыі», «Чырвоная пагроза Індыі», «Савецкая пагроза Індыі» і г. д.

Ангельскія газэты аддаюць шмат увагі вайсковаму будаўніцтву ў СССР, імкнучыся разьдзьмухаць сапраўднасьць. Так, сёлета ўвосень газэта «Дэйлі Мэйль» зьмяшчала артыкулы, прысьвечаныя нашым падрыхтоўкам да хімічнай абароны і вырабу намі атрутных газаў згодна формул, складзеных нямецкімі хімікамі. Яна паведамляла таксама пра пабудову новых авіяцыйных заводаў і пра тысячы самалётаў, якія будуюцца ў СССР. Зьмяшчаліся розныя фальшывыя весткі аб працы ТДА-Авіяхіму, аб удзеле жанчын у абароне краю і працы нашых вайсковых заводаў. Ангельскія і францускія газэты аддавалі шмат увагі агітацыі, якая нібыта праводзіцца намі, накіраванай да распаду армій заходніх дзяржаў. Зразумела, усім гэтым лямантам аб «чырвоным імпэрыялізьме» капіталісты толькі імкнуліся захаваць тую ваенную падрыхтоўку, якую яны самі праводзілі проці СССР. Англія ў сьпешным парадку праводзіла мерапрыёмствы па мэханізацыі і матарызацыі арміі, розныя манэўры, як паветраных, марскіх, так і сухаземных сіл. Узьнімаецца пытаньне аб неабходнасьці мэханізацыі індыйскай арміі і аб стварэньні там экспэдыцыйнага корпусу з тайнаю мэтаю барацьбы проці СССР.

І Францыя, якая ня спыняе крычаць пра «чырвоную небясьпеку», пра праникненьне бальшавізму ў армію, сьпешна ўхваліла новы закон аб абароне дзяржавы, які прадугледжвае нават мабілізацыю жанчын, праводзіць паўторныя лягерныя зборы, арганізоўвае вялікія манэўры ў Эльзасе і Лётарынгіі і праводзіць праграму ўзмоцненых марскіх узброеньняў.

Але ўсё гэтыя падрыхтоўкі, зразумела, не схаваліся ад рабочай клясы.

Напрыклад, нядаўна быў зьмешчан у ангельскай рабочай часопісі артыкул Юэра, у якім гэты аўтар апавядае аб плянах наскоку на наш Каўказ з боку Англіі. З гэтаю мэтаю ў Іраку знаходзяцца буйныя паветраныя сілы. Рабочыя арганізуюць мітынгі, дэманстрацыі, дзе яны заяўляюць аб сваёй прыхільнасьці да Савецкага Саюзу. Чужаземныя делегацыі, якія пабывалі ў нас у гасьцёх, здолеюць яшчэ больш выкрыць ваўнічыя замыслы імпэрыялістаў і перацягнуць на наш бок новыя атрады працоўных мас усяго сьвету.

А. С.

Да пастаноў XV партзьезду.

ГАЛОЎНЫ АРГАНІЗАТАР БАРАЦЬБЫ З БЮРАКРАТЫЗМАМ.

Задача палепшаньня і патаньненьня нашага дзяржаўнага апарату ўпіраецца ў неабходнасьць самай няшчаднай, самай рашучай барацьбы з бюракратычнымі скажэньнямі, якія ўсё яшчэ вельмі распаўсюджаны ў працы нашых дзяржаўных органаў. Некалькі прыкладаў пакажуць, якія вялічэзныя палепшэньні могуць быць у выніку гэтай барацьбы.

Прыблізна з год назад была распачата праца па праверцы дзейнасьці і скарачэньні ліку розных прадстаўніцтваў нашых дзяржаўных, гандлёвых каапэрацыйных арганізацый. Якія-ж вынікі гэтай працы? Было ліквідавана 1.346 прадстаўніцтваў і скарочана 2.242 працаўнікоў у пакінутых прадстаўніцтвах. Выдаткі на утрыманьне ліквідаваных прадстаўніцтваў і на аплату скарочанага штату ў пакінутых складалі 28,3 мілёны рублёў у год. Зразумела, што пры разглядзе пытаньня аб ліквідацыі таго ці іншага прадстаўніцтва была ўлічана праца, якая праводзіцца ім, і што ліквідаваліся толькі тыя прадстаўніцтвы, якія былі прызнаны сапраўды лішнімі. Такім парадкам, 28 мілёнаў рублёў эканоміі на скарачэньні адных толькі прадстаўніцтваў. Летась на VII зьезьдзе прафсаюзаў было зазначана, што НК Шляхаў траціць на справаздачнасьць 420 тысяч пудоў паперы ў год. Пасьля зьезду была праведзена праца на скарачэньні справаздачнасьці НК Шляхаў. У выніку на адной толькі Паўднёва-заходняй чыгунцы трата паперы на справаздачнасьць скарачана з 108 мілёнаў друкаваных аркушаў да 54 мілёнаў, г. зн. на 50 проц. Тыя ліквідацыі, праведзеныя тав. Куйбышэвым, у самых шырокіх масах працоўных мабілізаваць грамадзкую думку на барацьбу з бюракратычнымі скажэньнямі, на працу па адхіленьні сучасных нашых недахватаў. Прафсаюзы павінны быць арганізатарамі гэтай барацьбы, яе практычнымі правадырамі. З боку саюзаў у гэтай працы павінна быць выказана вялікая настойлівасьць. Неабходна мець на ўвазе, што зацікаўленыя органы звычайна вельмі супрэчаць у такіх выпадках сакэам, а перамагчы гэта—патрэбны сілы.

Нажаль, саюзныя арганізацыі да гэтага часу не заўсёды выказвалі ў гэтай працы належную настойлівасьць. Ёсьць выпадкі, калі ўзьнятыя саюзам пытаньні, зьвязаныя з адхіленьнем недалікаў у працы нашых гаспадарчых органаў, зацягваліся вырашэньнем на шмат месяцаў, і саюзныя арганізацыі ня ўжывалі належных захадаў, каб хутчэй правесьці намечаныя імі палепшаньні. Можна падаць пры прыкладу такі выпадак, надаўна зьмешчаны ў друку, накоўт гаражу маскоўскага аддзелу камунальнай гаспадаркі, калі з прычыны адкладу рамонту дзьверы ў гаражы псаваліся ад холаду і выбывалі з строю аўтабусы, якія маюць такое жыцьцёвае значэньне для пастрыманьня ўнутрыгародніх зносін у Маскве. Вінаўнікі гэтай начуванай бесгаспадарчасьці аддадзены зараз над суд і будуць пакараны.

Чаму, аднак, адпаведныя саюзныя органы, якія, бясспрэчна, ведалі пра гэтую безгаспадарчасьць, не дамагаліся своячаснага яе адхіленьня? Чаму гэтая безгаспадарчасьць была такою зацяжнаю. Нам здаецца, што мы тут маем выпадак слабай настойлівасьці саюзных органаў, малай рашучасьці ў правядзеньні імі сваіх прапаноў у галіне адхіленьня сучасных недалікаў у працы гаспадарчых органаў.

У справе барацьбы з бюракратызмам вялікае значэньне маюць чулыя, уважлівыя адносіны саюзных арганізацый да ўсіх заяў сяброў саюзу, да выступленьняў рабочых на агульных і дэлегацкіх сходах, да розных зазначэньняў сяброў саюзу. Сябра саюзу павінен быць упэўнены, што яго заява, у якой-бы форме яна ні была зроблена—вусная ці пісьмовай, кароткай ці падрабязнай,—ня будзе пакінута бяз увагі саюзнымі органамі, што апошнія ўжыўуць усе неабходныя захады, каб адхіліць заўважаныя недахваты.

Саюзныя арганізацыі павінны ўзмацніць сваю працу ў справе барацьбы з бюракратызмам, гэтая праца мае жыцьцёвае значэньне для нашага рэвалюцыйнага краю.

А. Алуф.

З НОВЫМІ СІЛАМІ—НА НЭПМАНА І КУЛАКА.

XV партзьезд ухваліў павялічыць нажым на капіталістычныя элементы, бо зьезд лічыць, што мы даволі моцныя для новага наступу проці непмана ў горадзе і кулака ў вёсцы. І сапраўды, у самай цяжкай для нас галіне, у гандлі, дзяржава і каапэрацыя прайшлі вялікі шлях і дамагліся вельмі значных вынікаў.

У гандлёва-пасрэдніцкім звароце ўдзел прыватнікаў з 27,4 проц. у 1924-25 годзе знізіўся да 18,1 пр. у 1926-27 годзе, прычым у опце—5 проц., а ў розьніцы—32,5 проц. Вучыцца гандляваць мы пачалі зусім нядаўна і за якіх-небудзь 5 гадоў ахапілі рынак амаль што ўсім оптам і на дзьве трэці розьніцы. Калі-ж мы параўнаем надворны выгляд крам, абыходзіны з пакупцом, падбор тавараў і г. д. зараз і гады 3-4 раней, дык убачым яшчэ большыя дасягненьні і ў дзяржаўным і ў каапэрацыйным гандлі. Ці можам мы распаўсюджваць свой уплыў у яшчэ большай меры?

Зразумела, можам.

Дзяржаўная прамысловасьць, павялічваючы выпрацоўку, аддае свой тавар амаль што выключна каапэрацыі; такім парадкам, перавага апошняй бясспрэчная. На рынку-ж сельска-гаспадарчых тавараў дзяржаўныя загатоўцы і каапэрацыя з году ў год няўхільна выціскаюць прыватніка; нам неабходна дамагацца павялічэньня сродкаў каапэрацыі шляхам прыцягненьня сялянскай ашчаднасьці ў выглядзе паёў. Прамысловасьць на 86 проц. у нашых руках, прычым прыватнікам належаць выключна дробныя прадпрыёмствы.

На сельска-гаспадарчым фронце барацьба з кулакамі павінна праводзіцца з такім разьлікам, каб у ёй удзельнічала ня толькі беднота, але і серадняцкая частка вёскі.

Ці ёсьць у нас адпаведныя ўмовы, каб павялічыць нажым на кулакоў і каб уцягнуць у гэтую барацьбу серадняка?

Партзьезд даў станоўчы адказ. І сапраўды, сельская гаспадарка даведзена да даваенных норм і, да таго-ж, мае шмат якасных дасягненьняў. Прыбытак земляробнага жыхарства павялічаецца за папярэдні і бягучы год на 15 проц. Павялічылася дастаўка сялянству машын і ўгноеньняў. Вучотна-пазыковыя апэрацыі крэдытнай сыстэмы з 2.492 мілёнаў рублёў у 1924-25 г. узьнімаюцца да 4.844 мілёнаў рублёў у 1926-27 г. і павялічваюцца да 6.019 мілёнаў рублёў у 1927-28 г. Збытавая каапэрацыя абярнулася ў магутную сілу.

Уздым сельскай гаспадаркі распачаўся толькі ў 1923 г.; у працягу апошніх гадоў яна станавілася на ногі; зараз яна ўжо моцна стаіць на нагах. Серадняк адчувае сябе моцна зьвязаным з савецкаю ўладаю і падтрымае яе ў барацьбе з кулаком.

Мы ўвашлі ў паласу новых грунтоўных дасягненьняў у галіне перамогі над капіталізмам і разгортваньня сацыялістычных адносін у СССР.

У. Сараб'янаў.

АБМЕН ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ.

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта з граніцы).

Наш цягнік з делегацыяй, якая прыехала сустракаць палітзьняволеных панскае Польшчы, прыбыў на ст. Коласава.

З цягнікам прыехалі сустракаць зьняволеных прадстаўнікі ўраду, ЦК КП(б)Б, МОПР'у, ЦСПСБ і інш.

У гэты-ж час да мяжы падышоў і цягнік з польскага боку.

На кардоне у 5-ці кронах ад нас—польская паліцыя, афіцэры, паны...

Прадстаўнікі дыпляматы і абодвых урадаў некалькі раз пераходзяць з аднае дзяржавы ў другую.

Паліцыя, якая так пільна сачыла за кожным рухам зьняволеных, расступілася. Шпаркім крокам рушылі наперад 9 чалавек зьняволеных са сваімі клункамі. Толькі што панская паліцыя штурхала іх за ўсё, што не падабалася, толькі што яны ня мелі права гутарыць з міліцыяй сабою. З першых крокаў у іх вырвалася гучнае „ура"...

Роўна а першай гадзіне і 10 хвілін адбыўся пераход граніцы зьняволенымі з абодвых бакоў.

Братэрскія прывітаньні, пацалункі...

У гэты час 29 чалавек, якія былі вызначаны на замен 9, таксама ўжо перайшлі мяжу. Яны ўліліся ў натоўп паліцыі, салдат, афіцэраў, жандармэрыі, шпікоў, карэспандэнтаў і фатографаў.

На нашым баку, пасьля кароткіх, але чулых прывітаньняў, быў наладжан мітынг.

З прамовамі выступалі: прадстаўнік ад ЦК МОПР'у тав. Калмык ад ЦК КП(б)Б—тав. Барушка, ад ЦСПСБ—тав. Кулаж, ад пагранічнай варты—тав. Апанасэвіч і інш.

З адказным прывітаньнем з пасярод прыбыўшых з Польшчы вазьняў выступілі таварышы Гржэльшчак і Альшэўскі.

Польская пагранічная варта, баючыся „бальшавіцкай заразы", зьняла з мяжы сваіх салдат-вартаўнікоў не без падставы: гучныя словы тав. Альшэўскага, якія былі праняты энтузіязмам, запалам і гатоўнасьцю змагацца несьліся ня толькі на месца, дзе стаялі гэтыя салдаты, але нават міліцыя далёка, дзе блішчылі паны натоўпам абкружалі толькі што перайшоўшых да іх 29.

Па абмену да нас перайшлі наступныя таварышы: Гржэльшчак, Мэртонс, Чэрнак, Райхэр Альшэўскі, Ротэр, Ільініч, Красінскі і Скакоўская. Некаторыя з іх актыўныя дзеячы рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі і Польшчы.

Прыбыўшых з Польшчы палітзьняволеных у Негарэлым сустрэлі чыгуначныя рабочыя арганізацыі, дзе пасьля гэтага быў наладжан таварыскі абед.

Пасьля гэтага цягнік прыбыў у Мінск, дзе было наладжана ўрачыстае спатканьне.

ЛІСТ АД ТАВ. ЛАНЦУЦКАГА ДА РАБОЧЫХ І СЯЛЯН СССР.

Атрыман ліст ад тав. Ланцуцкага, які знаходзіцца ў Макатоўскай турме ў Варшаве. Ліст тав. Ланцуцкага зьяўляецца адказам на ўзнагароду яго орденам Чырвонага Сьцягу на міжнародным кангрэсе прыяцеляў СССР. Ліст паступнага зьместу:

Дарагія таварышы!

Зрушан паведамленьнем аб тым, што на міжнародным кангрэсе прыяцеляў СССР я нагароджан орденам Чырвонага Сьцягу.

Вы зьмясьцілі мяне—скромнага рэвалюцыйнага дзеяча—побач з рэвалюцыянэрамі, якія маюць бязьмерныя заслугі ў справе змаганьня за міжнародную сацыяльную рэвалюцыю.

У гэтай высокай нагародзе я хачу бачыць і ба у выдзяленьне з пралетарыяту і сялянства Польшчы, якія змагаюцца з буржуазным ладам і яго фашыстаўскім урадам.

Пралетарыят Польшчы з вялікім зацікаўленьнем сачыць за сваёй сацыялістычнай бацькаўшчынай, якою для яго зьяўляецца СССР.

Сёньня вы яшчэ абкружаны жалезным ланцугом імпэрыялістычных разбойнікаў, якія рыхтуюцца да вайны супрэць адзінай у сьвеце пралетарскай дзяржавы, але міжнародны пралетарыят разарве гэты ланцуг і, патаптаўшы яго, затопіць у крыві буржуазіі.

ВАЙНЕ ВАЙНУ АБВЕСЬЦІМ... НАШУ САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ БАЦЬКАЎШЧЫНУ БУДЗЕМ АХОЎВАЦЬ ДА АСТАТКУ СІЛ. З ЧЫРВОНЫМ ШТАНДАРАМ ПОЙДЗЕМ НА ЗАРЁВУ СЬВЕТУ, А ВЕСЬЦІ НАС НА ГЗБАРАЦЬБУ БУДЗЕ МАГУТНЫ КАМУНІСТЫЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ, НАД ЯКІМ УЗВЫШАЕЦЦА НЯСЬМЕРТНЫ ДУХ І ВОЛЯ НАШАГА ГЭНІЯЛЬНАГА ПРАВАДЫРА—ЛЕНІНА.

На міжнародным фронце кіпіць заўзятая бой. Польская буржуазея—служка захадняэўрапейскіх імпэрыялістаў, кідае тысячалепшых байцоў Польшчы ў турмы. Але ні тэрор, ні турмы, ні сьмертныя прыгавары не зламаюць. Каля Чырвонага Штандару гуртуюцца і будуць гуртавацца з кожным разам усё больш і больш пралет ныяту і сялянства, каб пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі даць апошні бой сьвету эксплёатацыі і ўціску.

ЗЬНІШЧЫМ РАБСТВА, КАБ НА ЯГО РУІНАХ ПАБУДАВАЦЬ ПОЛЬСКУЮ САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ САВЕЦКУЮ РЭСПУБЛІКУ.

НЯХАЙ ЖЫВЕ СССР!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ПОЛЬСКАЯ ССР!

НЯХАЙ ЖЫВЕ САЦЫЯЛЬНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ ВА ЎСІМ СЬВЕЦЕ!

З камуністычным прывітаньнем
СТАНІСЛАЎ ЛАНЦУЦКІ.

Макатоўская турма,
1 студзеня 1928 г.

Аб формах землякарыстаньня.

У нас у БССР ёсьць старыя распаўсюджаныя і існуючыя па гэты час тры формы землякарыстаньня: першая—старая бабулька трохпалёўка, другая—сталыпінскія хутары і трэцяя—гэта больш позная і больш падходзячая—гэта пасёлкі, і як дадатак да іх—атрубы. Старая вёска ад старай формы павінна перайсьці на новую форму і выехаць на сацыялістычную каляю, а пагэтаму трохпалёўка павінна ў бліжэйшыя гады адмерці. Дзеля таго, каб прывесьці сельскую гаспадарку да калектыўнага землякарыстаньня, неабходна выбіць з галавы селяніна прыватную ўласнасьць і тыя формы землякарыстаньня, якія параджаюць яе з тым, каб пры першай сустрэчы ён казаў «не маё», а «наша», інакш кажучы, апралетарызаваць, убіць у яго галаву, што ён працуе дзеля існаваньня ўсіх, а ня толькі для сябе аднаго, гэта значыць дзеля тых, якія побач з ім і сумесна з ім працуюць. Дзеля гэтага неабходна ў групце перабудаваць вёску і правесьці земляўпарадкаваньне, прыстасаваўшы такую форму, з якой наперад відаць было-б, куды магчыма з ёю дайсьці.

У нас на Беларусі праходзіць земляўпарадкаваньне. Вёска перабудоўваецца. Галоўная форма, каля якой усё круціцца—гэта пасёлковая. Пакуль што ад гэтай формы рэальных вынікаў няма, таму няма, што яна патрабуе вялікай прапрацоўкі, вывучэньня і паправак. Ад хутароў і атрубоў мы таксама не адмаўляемся, але гэта дапушчаецца ў выключных выпадках. Сялянне і земельныя працаўнікі хваляць хутары і атрубы, даказваючы, што праз гэту форму землякарыстаньня магчыма хутчэй узьняць таварнасьць гаспадаркі. Гэта тая форма, якую раней выпрацаваў Сталыпін—форма чыста капіталістычная. Гэтыя таварышы бяруць яе пад крылы, бароняць і надхваліваючы. Гэта чысьценькая капіталістычная вадзічка з капіталістычнае крыніцы, якая можа ўзрадзіць старыя сталыпінскія думкі, адарваць ад грамадзкага жыцьця масы і паразьдзіць у іх варожыя адзін да другога адносіны. А гэта ўжо маецца ў сапраўднасьці, напрыклад: «ня езьдзі па дарозе праз мой хутар», «не пасі жывёлу на маёй сенажа

ЯК ГАСПАДАРЫЦЬ ЖАНЧЫНА.

(Гутаркі з членамі ЦВК БССР).

ПРАЦА СЯРОД ЖАНЧЫН РАЗГАРНУЛАСЯ ШЫРОКА—МАЛА ЗВАРАЧАЕЦЦА ЎВАГІ НА ТОРФАРАСПРАЦОЎКІ І АГНЯТРЫВАЛАЕ БУДАЎНІЦТВА—У ІЛЬНАВОДНЫХ РАЙЁНАХ ТРЭБА ЎЗМАЦНІЦЬ ЗАВОЗ ХЛЕБА.

Тав. Дубінчык.

(Сялянка Замоскага с-с., Асіпавіцк. р., член ЦВК).

Трэба сказаць праўду, што праца сярод жанчын у нас слаба праводзіцца. У нашым сельсавеце вельмі пашырана самагонка. Моладзь па вёсках—закраўдныя расколы і нікому не даюць праходу. Гэта навала, з якой трэба весьці барацьбу. Шмат нараканьняў выклікае ў нашым сельсавеце няправільнае разьмеркаваньне насёлкаў. Камерэік і ўпаўнаважаныя па

свайму погляду вызначаюць сядзібы для перасяленцаў. РВК пастанавіў адну сям'ю чырвонаармейца пакінуць на мейсцы, а каморнік не згаджаецца з гэтым. Бываюць выпадкі, калі служачым чыгунак адводзіць цэлыя арубы. Адным словам, у справе земляўпарадкаваньня ёсьць шмат няправільнасьцяй.

Няма ў нас парадку і з лесам. Даюць яго каму напала, а тыя прадаюць яго ў мястэчку. Былі гаткія выпадкі, калі гатовыя зрубы прадавалі на абгароджу інадрому ў Асіпавічах, а пасьля гэтыя-ж сяляне ізноў атрымалі лес.

Слаба разьвіта сярод нашага насельніцтва грамадзкая ініцыятыва.

Зруб на школу стаіць зрубленым з 1924 г. і ніяк ня могуць сабрацца, каб закончыць яго. Таксама і з мастом. Праз р. Сіню пачалі будаваць мост ды так і пакінулі яго.

Тав. Юшкевіч Алёна.

(Сялянка в. Навасёлкі, Пухав. р., Менскай акр., член ЦВК).

Праца сярод жанчын нашага раёну шырока разгарнулася. У вёсках працуюць жаночыя гурткі па вывучэньні кройкі і шыцьця, харавы, вайсковай санітарыі і стралковы.

Здавалася, што жанчыны ня будуць цікавіцца спортам, а на справе аказалася, што стралковы гурток у нашым раёне самы прывабны для жанчын. Сябры мі яго зьяўляюцца ня толькі дзяўчаты, а і кабеты. Дрэнна толькі тое, што ў нас мала зварачаецца ўвагі на пашырэньне сярод насельніцтва ваенізацыі.

Бяда ў нас з аналам. На кожную гаспадарку адпускаюць усяго па 3 куб. мэтр. дроў. Вось гэта выклікае шмат нараканьняў сярод насельніцтва. Тым часам у нас ёсьць шмат тарфяніка, якія можна з карысьцю эксплёатаваць, але няма каму навучыць гэтай справе сялянства. Таксама дрэнна і тое, што ніхто ня вучыць сялянства як будаваць агнятрывалыя будынкі, бо пры нястачы лесу агнятрывалае будаўніцтва навінна адыгрываць у нашым раёне вялікае значэньне.

Слаба праводзіцца работа па ліквідацыі няпісьменнасьці. Людзі прагнуць зьліквідаваць няпісьменнасьць; асабліва гэтай справай цікавяцца жанчыны.

Дрэнна абстаіць справа з аховай лясоў мясцовага значэньня. Іх ніхто не ўпарадкоўвае: сяляне нішчаць іх бяз жаднай літасьці. Калі справа гэтак працягнецца яшчэ некалькі год, то ад лясоў і сьледу не застанецца.

Наш раён чынна рыхтуецца да перавыбараў саветаў. У кожным сельсавеце праводзяцца сходы жанчын, у раёне будуць праведзены канфэрэнцыі вясковага жаночага актыву, нацменшасьцяй і раённы зьезд батрачак і работніц савецкіх гаспадарак.

Тав. Агеева Ганна.

(Сялянка в. Пагосьцішча, Высачанскага р., Віцебск. акр., член ЦВК).

Ня гледзячы на тое, што т. Агеева ўдава і мае 8 малых дзяцей, яна праводзіць значную грамадзкую работу.

— Наш раён,—кажа т. Агеева,—зьяўляецца выключна льнаводным.

Збожжа разводзіць мала. Зараз у раёне адчуваецца вялікі недахват хлеба і трэба парупіцца з завозам яго.

Бяда ў нас з аналам. Трэба ехаць па дровы за 30 клм., і даюць усяго па 2 вазы на год. Лес мясцовага значэньня, які быў у нас пад бокам, амаль ужо зьнішчаны. Цяпер трэба рашуча ўзяцца за здабываньне торфу і агнятрывалае будаўніцтва.

Летась мы арганізавалі самі дзіцячую ляцёўку, але гэтага мала: трэба арганізаваць некалькі яслёў.

Нейкай недарэчнасьцю зьяўляецца ў нас атрыманьне крэдытаў з сельскагаспадарчага крэдытнага т-ва. Каб атрымаць крэдыт на каня з Высачанскага т-ва, трэба хадзіць за 15 клм. некалькі разоў.

Сёлета наша вёска арганізавала сыраварны завод. Мы зацікаўлены ў тым, каб паленшыць гатунак быдла, але блізка няма гатунковых бугаёў. Трэба каб дзяржава арганізавала ў малочных пунктах злучныя пункты.

Да перавыбараў Саветаў.

Пад знакам блёку беднаты з серадняком.

З 1-га сьнежня г. г. па 15 студзеня 1928 г. па ўсёй БССР распачалася падрыхтоўчая кампанія да перавыбараў сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў.

За час справаздачнае кампаніі працоўныя павінны падагуліць вынікі нашага эканамічнага і культурнага ўзросту і выкананьне саветамі дырэктыў партыі і ўлады па правядзеньню мерапрыёмстваў накіраваных к эканамічнаму ўздыму нашае сельскае гаспадаркі і ўзмацненьня працы саветаў за лік шырокіх колаў працоўных мас гораду і вёскі.

Уся гэта праца можа быць праведзена з поспехам тады, калі нашы саветы правядуць як мага шырэй справаздачныя кампаніі перад сваімі абіральнікамі, пры адкрытай шырокай крытыцы ўсіх бакоў праробленае працы, каб усю гадавую працу саветаў падсунуць пад генэральны масавы кантроль працоўных. Трэба, каб у працэсе справаздачнай кампаніі саветаў, а таксама асобных сяброў саветаў і рэвкамісій, пры здаровай самакрытыцы працоўных выявілася ўсё творчае і карыснае, што дапаможа больш хуткаму тэмпу і больш кароткаму шляху росквіту ўсяе нашае народнае гаспадаркі, а з гэтым і палепшэньню жыцьця працоўных гораду і вёскі, каб усё гэта было прынята пад увагу новымі складамі саветаў і скарыстана ў практычнай працы.

Сёлетнюю справаздачную кампанію трэба падрыхтаваць так, каб да яе прыцягнуць яшчэ больш шырокія колы працоўных, асабліва неабходна зьвярнуць увагу на большае ўцягненьне, на большы ўздым актыўнасьці сярод рабочых, батрацтва, беднаты і жанчын пры адначасовым пагалбленьні савецкае пралетарскае дэмакратыі.

Пры справаздачах уся ўвага працоўных мас павінна быць накіравана ў бок нашага сацыялістычнага будаўніцтва, на больш шырокае разьвіцьцё сацыялістычных элемэнтаў у сельскай гаспадарцы, шляхам арганізацыі беднаты (пры дапамозе з боку дзяржавы крэдытам) у рознага роду т-вы, арцелі і калхозы, з ужываньнем новых форм землякарыстаньня і машыннай апрацоўкі зямлі. Гэта з аднаго боку будзе дапамагаць разьвіцьцю буйнае калектыўнае сельскае гаспадаркі, а такім чынам і ўздыму не таварнасьці і з другога—барацьбе з капіталістычнымі элемэнтамі ў вёсцы.

Перавыбарчая кампанія сельскіх саветаў у гэтым годзе павінна праходзіць над лёзунгам узмацненьня наступу на кулака з адначасовым узмацненьнем блёку беднаты з серадняком.

У гэтым годзе трэба зьвярнуць найбольш увагі да правядзеньня папярэдніх прадвыбарчых сходаў беднаты, батрацтва з сельска-гаспадарчымі рабочымі і жанчын, каб гэтыя сходы абярнуліся ў моцны арганізэўчы цэнтр па аб'яднаньню ўсяго сялянскага актыву пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі. Пры гэтым трэба мець на ўвазе вопыт мінулых перавыбарчых кампаній, што беднота мае больш моцны блёк з серадняком там, дзе яна лепш сама арганізавана.

Перавыбарчая кампанія гэтага году павінна прайсьці пад лёзунгамі:

а) большага залучэньня ў склады саветаў жанчын, процант якіх за апошнія гады паступова падае. Так калі ў 1924-25 г. жанчын у складзе саветаў было 11,9 проц., то ў 1925-26 г.—8,7 проц., а ў 1926-27 г.—7,98 проц.

б) пашырэньня ў саветах рабочага ядра за лік большага ўцягненьня ў склады сельскіх і местачковых саветаў сельска-гаспадарчых рабочых і батрацкоў, процант якіх на нашай акрузе мацца ніжэй таго процанту, які яны складаюць у агульным ліку насельніцтва акругі і

в) уцягненьня ў склад саветаў лепшых таварышоў з ліку вясковага актыву, сяброў партыі, камсамолу, дэмабілізаваных чырвонаармейцаў і інш.

З. Б—аў.

Аршанчына.

Год працы.

З 15 студзеня па 5 лютага на нашым сельсавеце будзе праводзіцца перадвыбарчая справаздачная кампанія

За год працы сельсавет мае значныя дасягненьні. Галоўныя з іх—арганізацыя пажарнае дружыны ў в. Грычына і набыцьцё ўсіх інструментаў. Адноўлена праца ячэйкі ТДА-Авіяхіму, завярбована ў адзін дзень 18 сяброў.

Арганізаваны тарфяныя таварыствы ў вёсках Грычына, Чаркасы, Фаніпаль-Вязынь і пас. Холмы. З іх працавалі Холменскае і Вязаньскае, што дало магчымасьць часткова забясьпечыць насельніцтва аналам.

У гэтым годзе адчынена новая школа ў пас. Холма, што дае магчымасьць наведаць школу дзецям беднякоў. Усяго школ па сельсавету зараз мацца 5, з іх 2 двухкамплектныя.

У сэнсе лепшай пастаноўкі працы сельсавету трэба адзначыць перавод усёй працы на беларускую мову. Больш зьвяртаецца ўвагі, у параўнаньні з мінулым годам на с.-г. пытаньні. Разгляд пытаньняў прэзыдыумам, а не адным старшынёю.

У галіне каапэраваньня ёсьць наступныя дасягненьні: набыта ўласнае памяшканьне для крамы ў в. Грычына і перанесены цэнтр з Грычына ў Фаніпаль, як у больш выгаднае месца.

За год працы с.-с. шмат зьвернута ўвагі на барацьбу з самагонам. Адабрана шмат апаратаў, якія адасланы ў раймілёцыю.

Вядзецца кантактная праца камітэту ўзаемадапамогі і сельсавету, на прэзыдыумах якога заслухоўваюцца справаздачы аб працы.

Гэта толькі галоўнае, што кідаецца ў вочы з працы сельсавету за год. А колькі нэпрыкметных на першы погляд дасягненьняў у штодзённай працы.

Але ўсё-ж такі поруч з дасягненьнямі ёсьць і недахваты, як то скаргі насельніцтва па адсутнасьці мэд. пункту ў в. Грычына, як у буйным пункце і на тракце (раней тут быў мэдыц. пункт).

Маюцца досыць значныя пасечкі лесу ў лясох мясцовага значэньня. Сельсаветам прымаюцца меры, але не дастатковыя. Віною гэтых пасечак—недахват аналу.

Недастатковая праца па рамонту дарог і мастоў мясцовага значэньня, а таксама па землябудаўніцтву, асабліва в. Грычына, якая дамагаецца пераходу на пясёлкі.

Слабая актыўнасьць членаў с.-с. у працы і прыняманьне мер з боку сельсавету, недастатковае кіраўніцтва камісіямі пры сельсавеце, слабае паступленьне падатку, слабае кіраўніцтва каапэрацыяй, у выніку чаго не скарыстан увесь фонд на каапэраваньне беднаты.

Вось усе тыя дасягненьні і недахваты, якія мае наш сельсавет за год свае працы і з якімі ён рыхтуецца выступіць на справаздачу перад насельніцтвам.

Аер.

Грычынскі с.-с., Самахвалавіцкі райён.

Да ўсіх сяброў саюзу савгандльслужачых, працуючых у вёсках і сёлах.

Дарагія таварышы!

З 15 студзеня г. г. пачнецца справаздачна-перадвыбарчая кампанія гарадзкіх і сельскіх саветаў. Выходзячы з вопыту мінулых перавыбараў, трэба адзначыць, разам з ростам актыўнага ўдзелу рабочае класы, значную адсталасьць удзелу ў перавыбарах сяброў прафсаюзаў, працуючых у вёсках і сёлах, і ў прыватнасьці сяброў нашага саюзу. У гэтым годзе адзначаны недастатак навінен быць рашуча зьніччан.

Саветы, як органы дыктатуры пралетарыяту, змогуць выканаць поўнасьцю сваю ролю толькі пры ўмовах актыўнага ўдзелу ў іх шырокіх працоўных мас, пагэтаму Цэнтральнае Праўленьне саюзу заклікае ўсіх сваіх сяброў як мага садзейнічаць гэтаму саюзу ў правядзімай імі працы па прасоўваньню ў сельсаветы батракоў і батрачак: дапамагаць у выпуску сацкоскіх і батрацкіх сьценгазэт, і наогул як мага садзейнічаць гэтаму саюзу ў правядзімых ім мерапрыёмствах, у сувязі з кампаніяй перавыбараў сельсаветаў.

На толькі максымальны ўдзел у перавыбарах саветаў сяброў саюзу, але і максымальная дапамога і садзейнічаньне саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых—вось лёзунг, пад якім навінна прайсьці справаздачна-перадвыбарчая кампанія саветаў.

З таварыскім прывітаньнем
Старшыня Ц. Праўленьня Арановіч,
Заг. Аркадзь ду Яндульскі.

Рыхтуюцца ўсе.

Падрыхтоўчая праца да перавыбараў сельсаветаў па нашым раёне пачалася з вылучэньня раённай выбарчай камісіі з 11 чал., якая правяла арганізацыйнае пасяджэньне і абмеркавала пытаньні падрыхтоўкі да гэтай кампаніі ў сельсаветах.

Назначаны старшыні сельскіх выбарчых камісій і ўпаўнаважаныя да іх і намечана прыблізная колькасьць выбарчых вучасткаў па сельсавету. Лік вучасткаў у параўнаньні з мінулым годам мяркуецца павялічыць да 124 па ўсім раёне, што дае павялічэньне на 26,5 проц. Гэта павялічэньне зроблена з мэтай набліжэньня вучасткаў да выбаршчыкаў і большага ўцягненьня насельніцтва ў перавыбарчую кампанію.

Справаздачная кампанія намечана з 15 студзеня да 5 лютага і выбарчая з 5 лютага да 5 сакавіка. У нарадку падрыхтоўкі будуць праведзены пашыраныя пленумы сельсаветаў, дзе будуць абгаварвацца пытаньні выбарчай кампаніі і справаздача аб гадовай дзейнасьці РВК. Апроч 13 справаздач РВК на пленумах намечана па населеных пунктах сельсаветаў перад грамадзянамі зрабіць 30 справаздач, каб больш азнаёміць насельніцтва з працай райвыканкому і каб насельніцтва з свайго боку змагло даць указаньні ў далейшай працы РВК.

З мэтай большага ўдзелу жанчыны ў перавыбарчай кампаніі намечана ў 13 пунктах раёну правесьці сходы-канфэрэнцыі жанчын, дзе будуць прапрацаваны пытаньні перавыбарчай кампаніі і ўдзел у ёй жанчын, бо яны ў мінулую кампанію бралі слабы ўдзел.

Наведамленьні сялян аб сходах будуць праводзіцца праз агульны загад насельніцтву, сельскіх выканаўцаў, членаў сельсаветаў, дзяцей-вучняў і пінэраў, з тым, каб усё насельніцтва было своячасова наведамлена аб сходах.

Насельніцтва раёну, атрымаўшы наведамленьне аб перавыбарах сельсаветаў, таксама пачынае падрыхтоўвацца, ужо паміж сабой гаворань аб недахопах працы сельсаветаў і каго трэба ў далейшым абраць. **Раманенка М.**

Прапойскі райён, Магілеўшчына

Вёска сёньня.

Актыўнасьць беднаты ў барацьбе з заможнікам.

(З перавыбарчых сходак к-таў узаемадапамогі).

Сярод Ніўчан.

Нядзеля... Мароз і сівер, што, як кажуць, добры гаспадар і сабакі вон ня гоніць.

Да в. Ніўкі ад Лагойску 6 вёрст. Дарога ўся лесам. У лесе—сьнег абапал дарогі патоптан ва камі.

— Кожны дзень па 4 па 6 стаямі х-дзяць,—кажа сустракаўшыся мне дзядька,—на дніях 2-х забілі. Вечарам хадзіць апасна.

Лес канчаецца. Вось у лагчыне сярод лесу невялічкая вёска Ніўкі. Хаця Ніўкі з усіх бакоў акружаны лесам, але ва ўсёй вёсцы выглядае больш прыгожа адна толькі хатка. Усе астатнія старэнькія, некаторыя чуць, чуць стаяць. Гэта ўжо сьведчыць што Ніўчане—беднякі.

Перад вёскай раскінуліся 2 хутары з вялікімі, прыгожымі будынкамі.

— Гэта раней шчыя панкі,—кажа дзядзька з Ніўак.

Запраўдныя „дзехцяры"—напішэце ў газэту.

Сходку рашылі скліканць у быўшага старшыні с-с.

— Дарма, што я нэпісьменны, але дзяла ішлі, а ўсё чыта мне і пісаў сакратар, кажа са задаваленьнем былы „прод."

Пашлі гутаркі:

— Мы запраўдныя „дзехцяры", жывём сярод лесу, як ваўкі, да нас ніхто ніколі ня ехце.

— Нават старшыня с-савету і то толькі ў год раз бывае, як піша зямлю на падатак

— Сходак у нас не праводзіцца.

— Хоць дваро ў нас і нямога (менш 20), але дзяцей школьнага ўзросту паўсотні. Раней была школка, але настаўнік Пастанаў—п'яніца, дзяцей вучыў дрэнна і як падалі заяву, настаўніка зволілі, а нам другога ня далі, скардзіцца быўны „прод", цяпер абяцаюць, абяцаюць і не даюць.

У другую вёску хадзіць нельга, далёка. Вось чаму мы ўсе нэпісьменныя. (У вёсцы толькі 3 чалавекі крыху пісьменныя).

Складасьцца ўражаньне, што запраўды над бокам цэнтру раёну закінутая вёска, якая рвецца даць сьвет хоць новаму, малаому пакаленьню. Дае памяшканьне пад школу і іншую дапамогу, а школы пакуль што не адчывіді, а гэта патрэбна.

На ўсю вёску выпісваецца адна газэта. Выпісвае батрак.

— Напішэце аб нас,—просяць—у газэтку.

За камітэт—супроць заможніка.

На сходку сабралася 83,3 проц. усіх двароў, а сяброў к-ту, маючых права выбіраць—39 пр. з іх жанчын больш 20 пр.

Дакзады аб працы райённага і сельскага камітэту ўзаемадапамогі па дакладу заслуханы і практычныя прапановы: набудаваць пачэльны завод, бо тут і раней такзавод быў і надта добрая глінэ.

— Паставіць пытаньне Райкамвайму перад належнымі органамі, каб усякія ўстановы і арцелі па разных распрацоўках і несазагатоўках абавязкова наймалі пісчыкаў праз камітэт узаемадапамогі і заключалі дагаворы.

Грамадзкім парадкам апрацоўваць памітэцкую зямлю і шмат іншых прапаноў у наказ.

— Сяброўскія ўзносы трэба плаціць, заназычаваць (за 2 гады) дзіквідаваць, кажуць беднякі.

— Няхай даруюць нядоімку ўзносаў, дык будзем плаціць з новага году гэтага,—уносіць прапанову заможнік Невяровіч.

Пе вторыя яго патрымліваюць. Пашлі спрэчкі, крыкі. Нарэшце прапанова:

— Хто хоча плаціць і каму патрэбен к-т, запісываецеся.

Запісываецца 29. Застаецца 5, з іх адзін серадняк і 4 заможнікі, былы панкі, у якіх адрэзалі зямлю.

— Вядома чаму, кажа дакладчык, яны багатыя, ня хочуць падтрымаць вас, бедных.

Ва ўсіх настрой супроць гэтых заможнікаў.

Невяровіч хоча даказаць, што ён адмаўляецца, бо ня мае магчымасьці плаціць уносы.

Яму не даюць гаварыць

Адна жанчына—батрачка кажа:

— Калі Невяровіч ня можа, дык хто можа ведаем мы Невяровіча.

Няёмка адчуваюць сябе заможнікі, але пярэчыць няма чым. Беднота права. З падаўніх як-бы „суседзяў прыцеляў", якімі адчувалі сябе на сходзе заможнікі: Невяровічы і Дуброўскія, яны пачулі да сябе кысавую варожасьць, пачулі сябе слабымі супроць вяскоўцаў-беднаты і ня прыняўшы ўдзелу ў выбарах упаўнаважаных пайшлі

Пахай ідуць, буркнуў нехта, абойдземся.

Выбары сельупаўнаважаных былі сурёзныя і актыўныя.

Абіта нельна абраць Давідчыка, ён батрак, граматны, актыўны і будзе добра прапаваць, у адзін голас заяўляюць усе.

Другога абіраюць серадняка плацячага падатку 10 р.

Позна, а 11-й гадзіне ўночы, папярэджаны нас у апасны ваўкоў па дарозе ў Лагойск і пажадаўшы лепшай далейшай працы новаму к-ту, Ніўчане сталі разыходзіцца.

Я. К.

Лагойскі р., Меншчына.

Нашы недахваты.

У працы Аярыцка-Слабадзкога с.-савету больш заўважана недахватаў, чым дасягненьняў.

Ён з першых крокаў адхіліўся ад дадзенага яму выбіральнікамі наказу: скласьці плян працы, зьвярнуць увагу на працу камісіяў і арганізацыяў на тэрыторыі савету.

Таму праца с.-савету насіла стыхійны бесплянавы характар. Камісіі ня былі адноўлены і таму зусім не працавалі А тым часам у лясох мясцовага значэньня зроблены былі вялікія парубкі, і лясох збыт парубшчыкамі у Менск.

Камітэт узаемадапамогі заснуў, праспаў веснавую і асеньнюю пасяўную кампанію, а сельсавет і пальцам не крануў, каб яго разварушыць. Адбылося 18 сялянскіх сходаў за справаздачны перыяд, з якіх сельсаветам былі праведзены толькі два, астатнія праходзілі самастойна.

Масты і дарогі засталіся разбуранымі, ня гледзячы на шматлікія паперкі і напаміны з Райвыканкому. Не прапрацоўваліся і ня выконваліся дырэктывы прэзыдыуму і пленуму РВК.

Няплянава праходзіла праца і по сінах правядзеньня пленумаў, за ўвесь час было праведзена 6 дзякуючы кампаніям, таксама і зыдымаў сельсавету, якіх было тоі 4.

У час кампаніі «Тыдню абароны» нічога ня зроблена.

Абсьледаваньнем выяўлена няпрывільная рэгістрацыя шлюбаў—бяз рычных справак і часта бяз подпісьведак, што заграмаджае працу статыстыка.

Выпуск сельсавет выступаў справаздачай перад насельніцтвам ніводнай не рабіў.

Але побач з такімі ёсьць і дасягненьні. Праведзены вёсках земляўпарадкаваньне на ў глухім кутку сельсавет

Райвыканкомам зроблена абсьледаваньне працы сельсавета менены адказныя прапаўнымі членамі сельсавету і працу чала наладжвацца.

Смалявіцкі райён.

Папярэднія вынікі выкананьня дзяржбюджэту за кастрычнік-лістапад 1927-28 бюдж. году.

Здаволеньне неадкладных патрэбаў рэспублікі і ажыцьцяўленьня прадугледжаных урадам па бюджэту мерапрыёмстваў патрабуе як ад фінансавых органаў, так і адведных ведамстваў асаблівай увагі да выкананьня прыбытковай часткі дзяржбюджэту.

У гэтым годзе, у зьвязку з напружанасьцю дзяржбюджэту, пытаньне аб прыняцьці належных захадаў да забясьпечаньня поўнага выкананьня прыбытковай часткі дзяржбюджэту павінна быць паставлена ва ўсёй сваёй шырыні.

У сучасным момант, па данных за кастрычнік-лістапад г. г., ёсьць магчымасьць падвесьці некаторыя ітогі выкананьня дзяржбюджэту БССР у 1927-28 г. і азначыць тэмп паступленьня прыбыткаў. Прыбыткі за кастрычнік-лістапад 1926-27 г. па бюджэту БССР, бяз Гомельшчыны, склалі —5.671.502 руб. у той час. як гэта паступленьне ў бягучым годзе склала—5.816.584 руб.

Такім чынам, адзэтуль відаць, што паступленьне прыбыткаў за 2 месяцы ў 1927-28 г. (бяз Гомельшчыны) у абсалютных лічбах, у параўнаньні з тым-жа перыядам 1926-27 г., дае плянчнае павялічэньне. Але калі прыяць пад увагу павялічэньне ў 1927-28 г. абёму выдатковай часткі дзяржбюджэту супроць 1926 27 г.—на 28,8 проц.—дык неабходна прыйсьці да высновы, што пры значным росьце выдаткаў па дзяржбюджэту 1927-28 г.—выкананьне прыбытковай часткі дзяржбюджэту ў кастрычніку-лістападзе г. г. ня можа быць прызнана на сарыяючым у сэнсе забясьпечаньня поўнага выкананьня выдатковай часткі дзяржбюджэту.

Ужо ў кастрычніку месяцы вывялася, што вытвараныя выдаткі па дзяржбюджэту БССР не пакрываюцца паступіўшымі прыбыткамі, і перавышэньне выдаткаў дасягнула 450.000 руб. Гэта станосьціча выклікала неабходнасьць перанясеньня на наступны квартал крэдытаў, з зачыненых на 1 квартал, ня менш як 820.000 руб., пры чым прышлося скараніць і некаторыя нават неадкладныя выдаткі, напрыклад, на барацьбу з беспрадоўем, фінансаваньне сельскае гаспадаркі і інш.

Аднак, ня гледзячы на правядзеньне наказанага мерапрыёмства, усё-ж пры параўнаньні паступіўшых за кастрычнік і лістапад г. г. прыбыткаў з вытвараньнямі за той-жа перыяд выдаткамі, мы маем, як і ў кастрычніку, значнае разыходжаньне паміж імі. Гэтак, паступіўшыя ў касы НКФ за 2 месяцы прыбыткі складаюць 7.285.347 р. пры выдатках у 7.780.912 руб.

Калі-ж прыяць пад увагу, што з крэдытаў, зачыненых на 1-ны квартал, перанесены на наступны квартал 820.000 руб., з якіх частка павінна была-б быць выдаткована ў працягу разглядаемых месяцаў, дык адзначанае разыходжаньне паміж прыбыткамі і выдаткамі яшчэ больш павялічыцца. Між тым, месяцы кастрычнік і лістапад зьяўляюцца сярэднімі ў адносінах выкананьня прыбытковай часткі дзяржбюджэту, наколькі ў гэтыя месяцы звычайна паступаюць значныя авансы па сельска-гаспадарчаму падатку і патэнтнаму збору.

Праўда, данныя паступленьні прыбыткаў у 1927-28 г. толькі за 2 месяцы не даюць магчымасьці зрабіць акрасьленыя выводы наконт выкананьня прыбытковай часткі дзяржбюджэту, але і за гэты кароткі перыяд ужо ёсьць магчымасьць адзначыць слабы тэмп выкананьня прыбытковай часткі дзяржбюджэту на некаторых прыбытковых крыніцах, што, галоўным чынам, і зьявілася прычынай значнага разыходжаньня паміж выкананьнем прыбытковай і выдатковай частак дзяржбюджэту. Так, сельска-гаспадарчы падатак за 2 месяцы гэтага году як у абсалютных лічбах, так і ў процантных адносінах да гадавога бюджэту прызначэньня дае слабейшы тэмп паступленьня, чымся ў мінулым годзе. Паступленьне сельска-гаспадарчага падатку за кастрычнік і лістапад месяцы 1926-27 г. па бюджэту БССР, бя Гомельшчыны, складае ў абсалютных лічбах 2.343.692 руб., альбо 30,3 проц., у той час. як гэта паступленьне ў бягучым годзе было—2.024.385 руб., альбо 24,8 проц. гадавога прызначэньня па бюджэту.

Па непадатковых прыбытках трэба адзначыць як найбольш слабае паступленьне па адлічэньнях ад прыбытку прамысловасьці і гандлю: усяго паступіла за 2 месяцы 141.000 р. альбо 6,1 проц. гадавога прызначэньня. Праўда, названыя адлічэньні ад прыбытку паступаюць у большасьці свае у III і IV кварталах г. г., але, калі прыяць пад увагу, што па адлічэньнях ад прыбытку прамысловасьці мацца 972.638 руб. недобору па бюджэту 1926-27 г., які павінен паступіць у бюджэт 1927-28 г., галоўным чынам, у працягу першых двух кварталаў дык неабходна прыйсьці да высновы, што ў адносінах паступленьня ў бюджэт адлічэньня ад прыбытку прамысловасьці і гандлю справа абстаіць на зусім сярэдняя.

Таксама слаба паступаюць даходы па збароту дзяржвыдаткаў, дзе асабліва прыбытковую крыніцу складае даход ад землякарыстаньня. Прызначана было на 1927-28 г.—630.400 руб., у лік якіх паступіла за 2 месяцы г. г. усяго 27.923 р., альбо 4 проц.

Паступленьне прыбыткаў за 2 месяцы (7.285.347 руб.) адносна гадавога прызначэньня на дзяржбюджэту 1927-28 году (46.146.340 р.) складае 15,8 проц. Калі-ж лічыць умоўна, што за 2 месяцы павінна было паступіць адна шостая гадавога прызначэньня, альбо 7.690.000 руб., то і ў гэтым выпадку мы маем недапаступленьне агульнай сумы прыбыткаў на 5,3 проц.

Якія-ж вывады напрашваюцца адзэтуль? Неабходнасьць прыняцьця належных захадаў да ўзмацненьня паступленьня прыбыткаў па тых прыбытковых крыніцах, на якіх ужо выявіўся слабы тэмп паступленьня, а таксама да забясьпечаньня поўнага выкананьня прыбытковай часткі дзяржбюджэту 1927-28 г.—вось адказ, які павінен быць кастаўлен у задачу як фінансавых органаў, так і ведамстваў, адмініструючых прыбыткі.

Д. М.

Па чатырох краінах.

(Ураженьні і сапраўднасьць).

За аглядам Парыжу.

На некаторых вестках у Парыжы штодня бывае, сярэднім, звыш двухсот тысяч чужаземцаў турыстаў. Яны прыяжджаюць з усіх канцоў сьвету наглядзець знатных мейсц і помнікаў гэтага гораду, пажыць і павесяліцца ў ім. Болей усяго ў Парыж наведвае амэрыканцаў, якія вязуць туды спускаць свае доляры. Нізкая французкая валюта адчыняе шырокую дарогу пану-доляру, якому ў Парыжы дасцца вялікая пашана. Ухіл перад амэрыканскім дзядзькаю вельмі яскрава ілюструецца Парыжам у час нашага быцьця там. Я ўжо казаў, што мы прыехаўшы ў Парыж, засталі там трыццаць тысяч амэрыканскіх легіянэраў. Апошнія запаўнялі ўсе вузіцы і прыметныя мейсцы гораду. Пачынаючы ад Пантэона і канчаючы распусьнымі дамамі Монмартра—усюды мігаліся легіянэрскія суконныя з жоўтымі нашыўкамі магаркі. Ім схіліліся тысячы нацыянальных сьцягаў, устаўленых на ўрадавых будынках. Перад імі раступалася публіка на бульварах і плацох, ім пакорліва служылі ў рэстаранах у танцовалах, у кафэ і ў кабарэ лакеі і ўпраўляючыя. Для іх спэцыяльна прыкамандыроўваліся гіды (праваднікі), даваліся асобныя трамваі, аўтобусы. Для іх быў наладжаны грандыёзны раут на надворку Дому Інвалідаў. Нават Гранд-Опэра, закасьцянеўшая ў рытуале арыстакратычнай традыцыі—зламала апошнюю перад амэрыканцамі. Загароджаная ад французкай беднай, рабочай і мяшчанскай публікі розными перашкодамі, з якіх галоўнаю зьяўляецца абавязак кожнаму мужчыну, які хоча быць у гэтым тэатры, адзець смокінг—і гэта пратухлая буржуазнасьцю цырымонья была адменена.

Гэтым выкарысталі і мы. У плане нашага азнаямленьня з Парыжам стаяла і наведаньне Гранд-Опэры. Але калі мы заікнуліся аб гэтым, то перакладчык нас пераняў досыць дзіўным для нас напярэджаньнем: вас бяз смокінгу ў Гранд-Опэру ня пусьцяць. Калі хочаце, бярэце смокінг на пракат. Што-ж за дзіва—можна. Міхасі, аднак, рашылі лепі ўзабрацца на раёк і прастаяць цэлы спэктакль у звычайных гарнітурах (на райку—пад столлю, адкуль вельмі цяжка што бачыць, можна было аставацца бяз смокінгу), чымсь браць на пракат смокінг. Куды было мне адставаць ад маіх сяброў—трэ' было згадзіцца. І вось, якаво было здзіўленьне перакладчыка, ніколі ня быўшага ў Гранд-Опэры за адсутнасьцю смокінгу, калі касырша ўрачыста заявіла: з прычыны прыезду амэрыканскіх легіянэраў можна на любое мейсца садзіцца бяз смокінгу. Мы купілі білеты другога раду на другім балконе і, дзякуючы легіянэрам, прасядзелі спэктакль звычайнымі людзьмі...

Мы трапілі ў Гранд-Опэра на опэру Р. Вагнэра «Валькір'я». Удзельнікі—артыстыя напаліся добрымі і выконвалі свае ролі мастацка. Зігмунда, Вотана, Брунгільду і Фрыку можна было слухаць з захапленьнем. Але слухаць ня так доўга, як таго патрабуе спэктакль. Магутная грымучая музыка Р. Вагнэра і адналстойнае, бяз успыкага руху, пяяньне артыстых —рабіліся утомнымі. Цяжка было высядзець тры з лішнім гадзіны—усё-ж мы даказалі славы дасканалых тэатралаў і высядзелі. У антрактах выкарысталі час для агляду будынку тэатру. Трэба сказаць, што будынак цікавы. Знадворку ён мае звычайны нарыскім будынкам сумна-зялёны выгляд. З архітэктурнымі ўборамі, з ніжкім, шырокім каменным ганкам пры ўходзе,—ён выглядае вытачаным з мармуру ў сярэдзіне. Асабліва робіць моцнае ўражаньне прасторнае, чыстае фае тэатру. Усюды адна манумэнтальнасьць. Пры гэтым, відацца ў вочы, што пры будове галоўная ўвага аддавалася не глядзельнай частцы, а фоёз. І гэта зразумела, фоёз Гранд-Опэры адведзена для промінаду і флірту, якія цікавей для арыстократыі, як самы спэктакль... Далёка нявыгадныя мейсцы для сядзеньня ў глядзельным залі яшчэ болей надаюць ахвоты хутчэй дачакацца антракту і пагуляць на сьветлым зэркальным фоёэ. І пастаноўка і сама ігра ў Гранд-Опэры старыя, трывіяльныя, далёка горшыя ад ігры і пастановак маскоўскіх і ленінградзкіх опэрных тэатраў... Да рэчы, калі мы днём раней наведалі другі французкі опэрны тэатр камічэскую опэру, то нас зьдзівіла ігра опэры «Кармэн». Чамусьці апошняя гралася на манэр опэрэтак, напалову ў гутарках. Дуётгія дыялёгі Донхозе і Кармэн, Тэрэадора і кантрабандыстых пры шэрай шабленнай дэкарацыі—зрабіла на нас зусім нявыгаднае ўражаньне... Яскравыя, дынамічныя, жыцьцёрадыя рэўю цягнулі нас да сябе.

Але апошнія, як і опэрныя тэатры, ішлі ў нас ня першым пунктам агляднальнае праграмы. Кожны (а ў тым ліку і мы), хто прыяжджае ў Парыж, перш за ўсё сьпяшыць аглядзець яго з трохсотмэтравай вышыні Эйфэлевай башты.

Надзвычай цікаўная рэч—знаходзіцца на гэткай вышыні і мераць пагляданем неасяжныя размахі вагромністага гораду. І сама па сабе Эйфэлева башта прыцягвае вашу ўвагу да сваіх прыгожых сталёвых пераплётаў, да стройнасьці пекна скансструіраванай калёны, лёгка шыбаючай угору. У сінім паветры яна губляе сваю грунтоўнасьць і робіцца цацкаю, сплеценай з дроту і адзетаю ў баярскую шапку. Здаецца гайдае яе лё

У САВЕЦЕ НАР. КАМІСАРАЎ БССР

Пасяджэньне 31 сьнежня 1927 г.

На гэтым пасяджэньні былі разгледжаны і прыняты рэзалюцыі па дакладах аб наступных пытаньнях, якія будуць стаць на парадку дню 2-й Сэсіі ЦВК БССР VIII скліканьня: 1) аб рэарганізацыі дзяржаўнага апарату і паляпшэньні працы Саветаў і іх выканаўчых камітэтаў, 2) аб дзяржаўным бюджэце БССР на 1927-28 бюджэтны год, 3) аб сыстэме народнай асьветы.

Саветам Народных Камісараў таксама зацьверджана назначэньне тав. Розіна А. Г. членам Прэзыдыуму Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР, 3 т.т. Шалаховіча Я. А., Райскага С. М., Грыгор'ева А. А. і Энкітэйна Б. П. звольнены абавязкі членаў Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР і назначаны т.т. Копанаў Г. Т., Руманаў А. Ф. і Пагоскі І. А. членамі ВСНГ БССР.

Пасяджэньне 2 студзеня 1928 г.

АДЧЫНЕНЬНЕ КРЭДЫТАЎ НА ЎТРЫМАНЬНЕ НОВЫХ УСТАНОЎ НК АСЬВЕТЫ.

НК Асьветы ўзьняў перад СНК хадайніцтва аб дазволе адчыненьня з 1-га студзеня 1928 году крэдытаў на ўтрыманьне новых устаноў, каб даць ім магчымасьць працаваць у бягучым навучальным годзе.

Савет Народных Камісараў пастанавіў адчыніць з 1-га студзеня 1928 году крэдыты на каштарысу НК Асьветы на ўтрыманьне наступных устаноў: 1) аўтатракторскія курсы ў Менску, 2) вячэрні рабочы тэхнікум у Віцебску, 3) школа сыраваبراў і масларобаў у Барысаве, 4) Лужаснянская сельска-гаспадарчая школа па тэхніцы культур і па апрацоўцы лёну.

АБ АСЫГНАВАНЬНІ СРОДКАЎ НА ЎТРЫМАНЬНЕ АДДЗЯЛЕНЬНЯ БЕЛ. ДЗЯРЖ. БІБЛІАТЭКІ Ў ВІЦЕБСКУ

Па хадайніцтву НК Асьветы Савет Народных Камісараў дазволіў зрабіць выдаткі з крэдытаў на каштарысу НК Асьветы на 1927-28 год на ўтрыманьне аддзяленьня Дзяржаўнай Бібліятэкі ў Віцебску да канца бягучага бюджэтнага году і запрапанаваў НК Асьветы да пачатку будучага бюджэтнага году ўнарадкаваць пытаньне з водпускам сродкаў на ўтрыманьне Бел. Дзярж. Бібліятэкі і яе аддзяленьняў.

АБ ПРОДАЖУ ХЛЕБНАГА ВІНА.

Па хадайніцтву Беларускага Аддзяленьня Цэнтрасьпіртэ Савет Народных Камісараў прыняў пастанову аб зьмене арт. 4-га пастановы ЦВК і СНК БССР за 27 кававіка 1926 г. „Аб рэгуляваньні продажу 40° хлебнага віна". Гэтым артыкулам устанаўлялася, што продаж у гарадох 40° хлебнага віна ў адны рукі абмяжоўваецца адной бутэлькаю (1/20 вядра). Паводле прынятай СНК пастановы продаж хлебнага 40° віна ў адны рукі ў зьвязку з пераходам на мэтрычную сыстэму мерак дазваляецца ў гарадох да 1 літру. Гэтая пастанова ўносіцца на зацьверджаньне Прэзыдыуму ЦВК.

НОВЫЯ ДАСЬЛЕДЧЫЯ СТАНЦЫІ ПРЫ БЕЛАРУСКІМ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫМ ІНСТЫТУЦЕ.

Савет Народных Камісараў па хадайніцтву Беларускага Навукова-Дасьледчага Інстытуту Сельскай і Лясной Гаспадаркі імя У. І. Леніна пастанавіў адчыніць пры Інстытуце наступныя дасьледчыя станцыі: 1) станцыю буйнай жывёлагадоўлі, 2) сьвіноводную станцыю і 3) цэнтральную бульбяную станцыю.

Хроніка.

Абсталяваньне для новага цагельнага заводу ў Клімавічах.

На днях з Нямеччыны, праз Управу Дзяржгандлю БССР, атрымана поўнае абсталяваньне для новага цагельнага заводу ў Клімавічах. На гэтым заводзе будзе вырабляцца белая цэгла, значна дзешавей чырвонай. Акрамя гэтага, завод дасьць магчымасьць выкарыстаць мясцовыя прыродныя багацьці.

У госьці на лінкор «Парижская Коммуна».

1-га студзеня з Менску выехала на падшэфны лінкор «Парижская Коммуна» дэлегацыя студэнтаў Белдзяржуніверсытэту ў складзе 45 чал.

Для падшэфнікаў закуплены падарункі.

На лінкоры будзе наладжан вялікі вечар беларускага мастацтва.

Зьмены пры прыёме ў ВНУ.

У наступным навучальным годзе ўводзіцца шэраг зьмен пры прыёме ў ВНУ. З прычыны таго, што паступаючыя ў ВНУ падаюць свае дакументы ў многія навучальныя ўстановы, што надта загружае працай прыймовыя камісіі, з наступнага году ад паступаючых у ВНУ будуць прымацца толькі арыгіналы дакументаў. Дазволен вольны пераход студэнтаў пестышэндыятаў з аднаго факультэту на другі.

Загранічныя камандыроўкі.

Дзеля павышэньня кваліфікацыі навуковых працаўнікоў у 1928 годзе вызначаны 32 замежныя навуковыя камандыроўкі у Нямеччыну, Францыю, Чэха-Славакію і іншыя краіны.

Школьнае будаўніцтва.

Згодна пляну ўвядзеньня ўсеагульнага навучаньня, у БССР павінна быць пабудавана 8.500 школьных камплектаў. На гэта патрабуецца асыгнаваньне ў працягу 13 гадоў у суме 34.000.000 руб.

Папаўненьне Белдзяржмузэю.

У 1927 годзе ў Беларускі Дзяржаўны Музэй паступіла 2000 розных экспанатаў.

Завочныя курсы па вывучэньні эсперанто.

Беларускі камітэт саюзу эсперантыстаў узьняў хадайніцтва перад НК Асьветы аб арганізацыі завочных курсаў па вывучэньні эсперанто. Мэта курсаў—падрыхтаваць працаўнікоў, якія-б маглі выкарыстаць свае веды для практычнай сувязі з загранічнымі рабочымі арганізацыямі.

Усебеларуская нарада акруговых інспэктароў аховы здароўя.

15-га студзеня пры НК Аховы Здароўя БССР адбудзецца Ўсебеларуская нарада акруговых інспэктароў і акруговых санітарных урачоў. Нарада абмяркуе пытаньні 5-пігадовага пляну Нар. Кам. Аховы Здароўя, аб паляншэньні абслугоўваньня мэдыцынскай дапамогай застрахаваных і інш.

13.351 чал. прайшло праз 2-ю ўсебеларускую мастацкую выстаўку.

Ужо падведзены вынікі працы 2-й усебеларускай мастацкай выстаўкі, праз якую прайшло 13.351 экскурсант.

47 новых электрамэханікаў.

7-га студзеня адбудзецца чарговы выпуск студэнтаў Віцебскага Дзяржаўнага Політэхнікуму. Гэты выпуск дасьць 47 новых кваліфікаваных электрамэханікаў.

Дапамога сем'ям чырвонаармейцаў.

Менскі Акруговы Аддзел Сацыяльнай Забясьпечкі па Менску аказвае дапамогу 38 сем'ям чырвонаармейцаў на 1 чалавека, 12 сем'ям—на 2 чал. і 3 сем'ям—на 3 чалавекі.

На 4.500.000 руб. выпусьцяць прадукцыі тэкстыльныя заводы БССР.

Белнайгандаль заключыў дагавор з Тэкстыльтрэстам на рэалізацыю гадавой прадукцыі падпарадкаваных апошняму заводаў. Усімі заводамі трэсту будзе выпушчана прадукцыі на 4.500.000 руб.

Завоз мэталётавараў.

Зацьверджан план завозу ў БССР мэталёвых тавараў на 1927-28 аперацыйны год. Згодна гэтага пляну, у працягу студзеня для абслугоўваньня беларускага рынку мэталёвымі таварамі будзе завезена 135 тон сартавога жалеза, 110 тон дахавага і 25 тон ацынкаванага.

Зьніжэньне выдаткаў у мукамольных прадпрыёмствах.

У сувязі з дырэктывамі ўраду аб скарачэньні адміністрацыйна-упраўленчых выдаткаў у 1927-28 г. на 20 проц., Нар. Кам. Гандлю БССР запрапанаваў усім дзяржаўным і каапэрацыйным мукамольным прадпрыёмствам прыступіць да ажыцьцяўленьня гэтых дырэктыў.

4.744.000 руб. на жыльлёвае будаўніцтва.

У бягучым годзе на жыльлёвае рабочае будаўніцтва будзе адпушчана досыць буйная сума—4.744.000 руб., галоўным чынам, для рабочых цэнтраў Беларусі—Менску, Віцебску, Гомелю і Бабруйску.

15.000 руб. на загатоўку насеньня канюшыны.

Белсельбанк адпусьціў Віцебскаму Акрсельбанку 15.000 руб. на набыцьцё насеньня канюшыны, якое павінна быць загатоўлена ў межах акругі праз сельска-гаспадарчую каапэрацыю.

КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ЯЧЭЙКУ ТДА-АВІЯХІМУ.

Магілеўскі акруговы савет ТДА-Авіяхіму зараз вядзе ўзмацнёную падрыхтоўку да правядзеньня на акрузе конкурсу на лепшую ячэйку ТДА-Авіяхіму, лепшы вайсковы гурток і лепшы вайсковы куток.

Гэты конкурс будзе прыстасаваны да сьвяткаваньня 10 гадавіны Чырвонай арміі.

ДАСЯГНЕНЬНІ І НЕДАХОПЫ Ў ПРАВЯДЗЕНЬНІ ШКОЛЬНАГА ПЕРАПІСУ Ў БССР.

Весткі з акругі Беларусі гавораць аб тым, што апытальныя фармуляры на школьным перапісу і бягучым абсьледваньні іншых культасьветных устаноў на мясцох былі атрыманы і разьмеркаваны па асьветных установах своячасова.

На ўсіх акрсэтабюро паміж 21 лістапада і 1-га сьнежня адбыліся зьезды райённых кіраўнікоў, пасьля аднаведных дакладаў рабілася інструктаваньне па запаўненьні статыстычных бланкаў. Для інструктаваньня настаўнікаў былі скарыстаны чарговыя райённыя асьветніцкія канфэрэнцыі, а там, дзе яны ўжо прайшлі, склікаліся спэцыяльныя дэлегацкія нарады.

Падрыхтоўчая праца да перапісу ў школах распачалася з 12-га, а мясцамі нават з 9-га сьнежня, але былі і выязкі, што некаторыя загадчыкі школ да 15 сьнежня (кратычнага дню перапісу) не праводзілі ніякай падрыхтоўчай працы.

Ёсьць таксама весткі і аб несваячасовай здачы некаторымі школамі перапіснога матар'ялу. Прыходзіцца адзначыць, што да правядзен ня школьнага перапісу дзе-ні-дзе адносіліся не з належнай увагай:—у некаторых выпадках несваячасове прадстаўленьне перапісных матар'ялаў тлумачыцца нязбыйнымі адносінамі да гэтай вельмі важнай працы з боку загадчыкаў школамі, прычым у гэтых адносінах асабліва вылучыўся Менск.

Аб правядзеньні школьнага перапісу ў райёнах дакладных вестак яшчэ няма, але першыя данныя кажуць аб тым, што на мясцох пытаньню перапісу была аддана належная ўвага. Неабходна заўважыць, што вялікую дапамогу ў правядзеньні перапісу на мясцох аказалі выканкомы і прафарганізацыі.

Усе матар'ялы ў ЦСУ паступяць да 1-га лютага, у працягу студзеня акрстабюро павінны гэтыя матар'ялы прыняць, праверыць якасьць працы і скласьці кароткую справаздачу з першымі папярэднімі вынікамі перапісу.

З ЦСУ СССР атрымана паведамленьне, што цэнтральная камісія па правядзеньні школьнага перапісу ўжо прыступіла да разгляду і распрацоўкі перапісных матар'ялаў. 1-га лютага ў Маскве адбудзецца ўсесаюзная нарада пры ЦСУ СССР працаўнікоў саюзных і аўтаномных рэспублік. На гэтай нарадзе канчаткова будуць зацьверджаны плян і праграма па распрацоўцы перапіснога матар'ялу.

СУД.

ВЫНІК СЛУЖБЫ КУЛАКА.

Пасьля перадачы Уваўдзенскім лясьніцтвам сялянам вёскі Лазараўшчына лясоў мясцовага значэньня быў скліканы агульны сход для абраньня ўпаўнаважанага над лясамі.

Прадвыбарная кампанія была праведзена пасьпех, і ўпаўнаважаным праз кулак Сьцяпан Лукашэвіч, які мае 25 дзесяцін зямлі.

Ідучы са сходкі, кулакі раздаваліся:

— Хоць раз ды перамога на нашым баку: Лукашэвіч—свой чалавек, з ім можна будзе нагаманіць пакоп уласнасьці лесу.

Сапраўды, кулакі часта зьбіраліся, шапталіся паміж сабой, як бы зноў зрабіцца ўласьнікамі лясоў; туды-сюды зьявіталіся з халайніцтвам, але адказ атрымоўвалі адзін: «Уласнасьці на лясы і зямлю няма".

Упэўніўшыся, што лес будзе адпушчана беднаце, кулакі скарыстали пэрыяд службы Лукашэвіча і баз усякага пляну і дазволу высеклі 110 дроў, на суму 527 р.

Калі Лукашэвіча за нядбайства прыцягнулі да адказнасьці, ён сказаў: «Я не пільнаваў лесу таму, што не атрымліваў пэнсіі, і ня было часу сачыць, каб ня секлі лесу".

Менскі акруговы суд, разглядзеўшы гэту справу, прыгаварыў Сьцяпана Лукашэвіча на паўтара гады зьяволеньня, але на аснове амністыі ўраду СССР скараціў кару напалову.

Д. Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Недарослы забойца.

Грамадз. вёскі Старыя-Дарогі, Чэрвенскага райёну, Алесь Камінскі, будучы яшчэ хлапцом, любіў хадзіць на вечарынкі і піць самагон. Такое выхаваньне зусім сапсавала хлапчука, і ён зрабіўся хуліганам. 20 верасьня 1925 году на вячорцы Камінскі паспрачаўся з Дубовікам, з дарослым хлапцом, і нарваў яму важом у жывот, ад чаго Дубовік і памёр. Менскі акруговы суд прыгаварыў Алеся Камінскага на сем год зьяволеньня, скараціўшы пакараньне, як недаросламу на адну трэць і па амністыі напалову, агулам да 2 год і 4 месяцаў.

Гатовыя харчы і выпіўка.

Грамадз. г. Барысава Алесь Колбік на старасьці гадоў захацеў добра пажыць. Маючы ўжасны дом, ён адчыніў прытулак расцусты. У ніці пакоях разьмясьціў 5 прастытутак і за гэта атрымліваў ад іх гатовыя харчы і кожны вечар выпіўку. «Сытае" жыцьцё Колбіка парушыў Крымінальны Вышук, які прыцягнуў яго да адказнасьці. Выязная сэсія акруговага суду прыгаварыла Алеся Колбіка на тры гады зьяволеньня, скараціўшы гэту кару напалову па амністыі.

КУТОК РАБСЕЛЬКОРА.

Ці патрэбен селькору білет?

Пытаньне аб селькораўскіх білетах даўно ўжо вырашана. Сыстэма выдачы білетаў рабкорам і селькорам даўно адменена і адышла ў нябыт. Здавалася-б, што ўзьнімаць гэта пытаньне на старонках газэт ізноў непатрэбна. Але на вялікі жаль, мы да апошняга часу сустракаем ня толькі „маладых" але і „старых" селькораў, якія мараць „заслужыць" няіснуючы селькораўскі білет.

Што-ж прымушае гэтых таварышоў прасіць рэдакцыю аб высылцы білетаў?

Якія прычыны ляжаць у аснове іхніх заяў?

Трэба адзначыць, што прычыны гэтыя ў розных селькораў неаднаковыя. Напрыклад, адзін селькор (Ульдзенскага р. Менчына) піша: „Прашу вас выслаць мне карэспандэнцкі білет, бо ў пагранпаласе, зьбіраючы статыстычны матар'ял, сустракаешся з вашчынай і наогул працаваць без яго ў нас занадта трудна".

У другім лісьце гэты-ж таварыш кажа, што некаторыя мясцовыя працаўнікі абзываюць яго шпіёнам і проста выганяюць з установы, бо ён ня мае селькораўскага білету.

Другія ў сваіх заявах скардзяцца, што яны бяз білета зьяўляюцца юрыдычна неаформленымі селькорамі і г. д.

Адным словам—матывы розныя.

Але ўсе яны гавораць аб тым, што гэтыя селькоры не ўпаўне зразумелі задачы селькораўскай арганізацыі.

На самай справе. Ці-ж можна згадзіцца з довадамі першага таварыша? Бязумоўна, нельга.

Дзеля таго, каб селькору былі вядомы лічбы (а лічбамі патрэбна ўгрунтоўваць кожны допіс), саўсім ня трэба білета. Для гэта трэба толькі адно—прымаць актыўны ўдзел у грамадзкай працы.

Скажам, к прыкладу, сёньня на сходзе сялян данной вёскі ці сельсавету павінна абгаварвацца справаздача прэзыдыуму сельсавету, школы, КСУ, ці сельска-гаспадарчага крэдытнага таварыства, альбо спажывецкага т-ва ці лясьнічага, райвыканкому і г. д.

Селькор гэтымі пытаньнямі цікавіцца і жадае напісаць аб працы, скажам, с.-г. т-ва ў газэту; высьветліць усе дадатныя моманты ў яго працы і недахопы.

Ясна, кенскі той селькор, які на гэтым сходзе ня будзе прысутнічаць, а назаўтра «з выглядам начальніка" пойдзе да кіраўніка ўстановы, які ўчора рабіў справаздачу, за статыстычным матар'ялам.

Ня чуўшы спрэчак сялянства на гэтую пытаньню, іх пажаданьняў, прапаноў, ня ведаючы іх адносін да гэтай установы і асобных яе працаўнікоў (што асабліва выяўляецца на сходах), гэты, выбачайце, селькор бярэ лічбы і пачынае „высьвятляць".

Другая справа, калі тая альбо іншая ўстанова саўсім адарвана ад жыцьця і сялянства, калі гэта ўстанова замуравалася ў чатырох сьценах свайго будынку і не жадае паказацца на сьвет. Але-ж гэтыя ўстановы сустракаюцца вельмі рэдка.

А калі дзе-небудзь гэткія ўстановы маюцца, аб іх трэба пісаць у газэту.

Каб унікнуць магчымых памылак і непаразуменьняў селькоры павінны наладзіць сувязь з усімі ўстановамі свайго сельсавету, устанавіць правільныя ўзаемадносіны з імі. Хто з прадстаўнікоў адмовіцца зрабіць інфармацыю на сходзе гуртка селькораў аб працы сваёй установы, калі між гуртком і ўстановай ці арганізацыяй будзе шчыльная сувязь? Ніхто.

Значыць прычынай селькораўскіх „кавуў" дач зьяўляецца не адсутнасьць білета ці яго „юрыдычная неаформленасьць", а найменьше належным чынам разгарнуты ім.

Актыўны ўдзел селькора ва ўсёй грамадзкай працы, цесная сувязь селькораў і іх гурткоў з усімі мясцовымі ўстановамі і арганізацыямі і, у першую чаргу, з актыўнымі ячэйкамі—вось чым селькор заняе аўтарытэт і давер'е як насельніцтва, так і мясцовых працаўнікоў. Ніякі білет гэтага ня дасьць.

Білет селькору не патрэбен.

М. Ш.

Селькораўская нарада.

У другой палове сьнежня адбылася ў м. Касьцюковічах нарада селькораў, якая зьяўляецца амаль першай за апошнія гады. На нараду зьявілася больш 25 таварышоў. Прадстаўнік ад газэты „Беларуская Вёска" зрабіў даклад аб працы „Бел. Вёскі" і працы з селькорамі. Селькоры гэтым дакладам зацікавіліся, аб чым сьведчаць запытаньні па дакладах і сярэчкі. Пасьля гэтага сьледчы правёў гутарку на тэму „рэвалюцыйная законнасьць і селькор". Ён падкрэсьліў што з Касьцюковіцкага райёну мала півуць пралачыстых ў вёсны. У сярэчках было адзначана, што неабходна часьцей скліканьне такіх нарадаў і выказані пажаданьне, каб у бліжэйшы тэрмін была склікана ўсебеларуская нарада селькораў. Трэба спадзявацца, што цяпер селькораўская праца ў нашым райёне паленьшыцца. Селькоры, таксама, чакалі прадстаўніка ад „Магілеўскага Селяніна", які абяцаў прыехаць на нараду але яго не дачакаліся.

Ран.

Фізкультура.

Спаборніцтвы гуртка фк. саюзу савгандальслужачых.

На спаборніцтвах на падняцьці цяжараў гуртка ф. к. саюзу савгандальслужачых на першае месца выйшлі т. Вайнілові ч у лягчэйшай вазе, які набраў 850 фунтаў (рывок дзьвума рукамі—170 ф. і таўчок адной—165 ф.), і т. Рэнге у лёгкай вазе, які набраў 880 фунт. (жым дзьвума рукамі—205 ф. і рывок дзьвума рукамі—175 ф.). На акруговых і ўсебеларускіх спаборніцтвах выступіць савгандальслужачы т. Савіч (вага пяра) з прыблізным вынікам 910-915 ф., які намнога павысіць старое ўсебелар. дасягненьне.

Міжклюбныя спаборніцтвы.

Закончыліся міжклюбныя спаборніцтвы на падняцьці цяжараў і барбе. Удзел прымалі 3 клюбы („Дынамо", „КІМ" і клюб імя Р. Люксэмбург).

Першыя месцы атрымалі: у вазе пяра—т. Лапідус (754½ ф.), у лягчэйшай вазе—т. Механік (847 ф.) і ў лёгкай вазе—т. Серабранскі (828).

На барбе на першых месцах т. т. Поўікаў („Дынамо"—вага пяра), Мацык клюб „Р. Л."—лёгкая в.) і Механік („КІМ"—лягчэйшая в.).

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

Партыйнае жыцьцё

Праца ЦКК-РСІ ў 1927-28 годзе.

Прэзыдыум ЦКК-РСІ зацьвердзіў наступны плян работ па вывучэньню партпраблем і партправерачнай работы.

У першую чаргу ідуць тэмы па праверцы дырэктыў партыі; у гэтых адносінах будзе зроблена наступнае:

Праверка выкананьня дырэктыў партыі па нацпалітыцы, праверка выкананьня партдырэктыў аб рабоце савячэек па барацьбе з бюракратызмам (праверка выкананьня прапаноў абсьледаваньня ЦКК 1927 г.), праверка выкананьня ЛКСМБ пастаноў сакавіковскага пленуму ЦК КП(б)Б, праверка выкананьня дырэктыў абсьледаваньня ЦКК аб унутрыпартыйнай дэмакратыі.

Зараз пачнецца абсьледаваньне камітэтаў і савпартшкол пад пунктам гледжаньня праверкі якасьці падрыхтоўкі партыйных кадраў і праверка дысцыпліны партыі па пытаньню аб заданых камандыроўках.

У галіне барацьбы з бюракратызмам маюць быць вывучаны наступныя пытаньні: дзейнасьць судова-сьледчых органаў па барацьбе з бюракратызмам, валакітай, праверка хуткасьці разгляду ў судова-сьледчых органах спраў, якія ўзбуджаюцца органамі КК-РСІ, праверка хуткасьці праходжаньня і рэагіраваньня на скаргі рабкораў і сялян у органах РСІ, пракуратуры і выканкомаў.

У галіне барацьбы з хворымі зьявішчамі намячаецца абсьледваньне дзейнасьці ячэек і райкому па папярэджаньню і барацьбе з хваробнымі зьявішчамі сярод камуністых.

У галіне рэгуляваньня росту партыі намечана абсьледаваньне дынамікі росту (прыём) і выбылі (выключэньні, выхады) арганізацыі КП(б) Беларусі і выкананьне пардырэктыў у галіне рэгуляваньня росту партыі.

З пытаньняў сувязі з масамі будзе зроблена праверка выкананьня дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб прыцягненьні мас і грамадзкіх арганізацый да працы па зьніжэньню цэн і барацьбы з недахопамі апарату, каапэрацыі, праверка рэагаваньня ўстановамі і арганізацыямі на рабселькораўскія заметкі.

Праца ЦКК-РСІ разьлічана на падтрыманьне з боку ўсіх працоўных, з дапамогай якіх яна будзе з посьпехам выканана.

Р. Г.

Вылазка камсамоліі на вёску.

(Зембін).

Калавек 20, камсамольцаў і пастачковай ячэйкі ЛКСМБ ня ў вёску Жарсьцьвянку з мэтаю масавага вечара раскоўвай моладзьдзю. Справа была падрыхтавана. Зараней абгаворана досыць вялікае паньне. Музыкант быў свой камсамол.

Камсамольцы прышлі першымі. У ... кідалася дысцыплінаванасьць і камсамольская прыветлівасьць. Вечар пачаўся патаварыску.

Камсамол прывітаў моладзь сваёй гучнай песьняй. Новы, бадзёры матыў упосіў вясёлы настрой. Трэба адзначыць, што сьпевы праходзілі жвава і досыць добра. Большая частка камсамольцаў—вучні сямігодкі.

Вестка аб вечарынцы хутка ахваціла ваколіцу і падняла ўсю моладзь на ногі. Кватэра перапоўнілася народам. Нават старыя заглянулі да нас.

Новы факт паставіў вясковую моладзь спачатку ў бязьдзейнасьць. Яна нейкім чаканьнем трымала сябе з боку, але для жвавасьці пушчаны ў ход агульныя сьпевы. Тут камсамолкі ... застрэльшчыкамі спайкі. Разам з ... пачалі сьпяваць вясковыя сьні. Мэта—дасягнута. Утварылася здаровая атмасфэра суцэльнага калектыву, што неабходна было для выкананьня праграмы вечара.

Праграма вечара выявілася ў наступным:

1. Сьпевы.
2. Вусная газэта.
3. Дэклямацыя.
4. Скокі.

На вечары вызначалася зрабіць дакład аа значэньні гэтага вечара, але абставіны дыктавалі замяніць яго вуснай газэтай, якая прайшла жывей.

Стала (напісанай) арганізаванай на першых кроках газэты выпусьціць не ўдалося.

Многа задавалася пытаньняў аб сельскай гаспадарцы, аб падатку, аб значэньні гэтага вечара і г. д. На ўсе пытаньні былі дадзены адказы камсамольцам-настаўнікам, маючага вышэйшую асьвету.

Дэклямацыя таксама знайшла сваё спачуваньне ў слухача. Матар'ял быў падобран такі, што мог усхваляваць чулую душу беларуса.

Усё гэта праходзіла з увагай і цікавасьцю.

Не гаворачы аб тых задавальненьнях, выказаных сялянствам, што прышлося пачуць кожнаму з камсамольцаў, я хачу падкрэсьліць задавальненьне аднаго старога, які ад шчырага сэрца гукаў:

«Хай жывуць кум-само-оль-цы на многае лета!».

Наглыбіць праграму вечара, як гэта вызначалася, за кошт гульняў, было немагчыма з прычыны цеснаты.

Спроба масавага вечара ўдалася. Пастаўленая мэта дасягнута. Задачы—апраўдаліся. Вечар прайшоў спакойна, без непаразуменьняў, і досыць удачна. Будзем чакаць і спадзявацца, што добры пачатак знойдзе далейшае пашырэньне сярод вясковай моладзі, якая выказала падзяку пры разьвітаньні.

Прысутны.

Праца з сялянамі-літоўцамі.

Для абслугоўваньня рабочых і сялян літоўцаў масавай працай пры некаторых акругкомах КП(б)Б былі створаны літбюро, а ў асобных акругах былі вызначаны ўпаўнаважаныя па працы сярод літоўцаў пры акругкомах партыі.

У літоўскіх калёніях арганізавана 15 літоўскіх чырвоных кутоў, адчынена адна літоўская школа і хата-чытальня.

Пры Інбелкульце арганізавана катэдра па вывучэньні літоўскай культуры.

У 6-ці райёнах з вялікай колькасьцю літоўскага насельніцтва праведзены райённыя канфэрэнцыі беспартыйных сялян-літоўцаў. У рабоце канфэрэнцый прыняло ўдзел—742 чал. Па канфэрэнцыях былі абгаворваны больш хвалюючыя сялян-літоўцаў пытаньні (аб зямляўпарадкаваньні, аб адчыненьні літоўскіх школ і інш.). Праведзены мітынгі з пастаноўкай дакладаў аб міжнародным становішчы і ў прыватнасьці аб становішчы ў Літве. У пэрыяд летніх вакацый у літоўскіх калёніях праводзілі работу 8 студэнтаў літоўскага сэктару Камуністычнага Унівэрсытэту нацменшасьцяў Захаду імя Мархлеўскага. Дзякуючы іх работе ніводная калёніі не засталося не абслужанай дакладамі і гутаркамі на літоўскай мове.

Разгорнута ўзмоцненая падрыхтаўчая работа да скліканьня на 8 студзеня першага ўсебеларускага зьезду сялян-літоўцаў.

З мая 1927 году арганізавана рэгулярнае выданьне двохтыднёвай літоўскай-сялянскай газэты «Чырвоны Пахар» («Раўданасіс Арэнас»). Газэта гэта, якая зьяўляецца вялікім дасягненьнем у літоўскай нац. рабоце, чытаецца ня толькі ў СССР і за кароткі тэрмін яе існаваньня заваявала даволі значны лік падпісчыкаў. 50 проц. усіх двароў літоўскіх калёній выпісваюць газэту.

Літоўскае сялянства праз сваю газэту падтрымоўвае сувязь з усімі літкалёніямі Савецкага Саюзу і з рабочымі арганізацыямі капіталістычных краін.

Адны толькі рабочыя арганізацыі Злучаных Штатаў Амэрыкі, Аргенціны выпісваюць 300 экз. газ. „Чырвоны Пахар".

У лістападзе вышаў з друку першы савецкі лемантар на літоўскай мове „Вучыся і працуй".

Выходзіць з друку зборнік рэвалюцыйных сьпеваў на літоўскай мове.

Клюбная праца праводзіцца ў польскім клюбе імя «Розы Люксэмбург».

У выніку праробленай сярод літоўскага насельніцтва працы, маецца пералом у настроях літоўцаў. Падагуліць працу сярод літоўцаў, абгаварыць становішча сялян-літоўцаў павінен ўсебеларускі зьезд сялян-літоўцаў, на які зьяжджаюцца 62 дэлегаты ад літоўскіх калёній.

АПА ЦК КП(б)Б заняло пытаньнем падрыхтоўкі новых палітасьветных працаўнікоў па абслугоўваньню літоўскіх калёній. З наступнага навучальнага году неабходная колькасьць месц у Магілеўскай і Віцебскай савпартшколах будзе адведзена для літоўцаў партыйнаў і камсамольцаў.

Прапанована акругкомам КП(б)Б узмацніць працу сярод літоўскага насельніцтва.

Частка месц у Белсельтэхнікуме будзе адведзена літоўцам, для падрыхтоўкі настаўнікаў літоўскіх школ.

Усебеларускі зьезд сялян-літоўцаў бязумоўна яшчэ больш падатурхне ўпорную працу сярод літоўцаў.

Р.

Крэдытаваньне сельскай гаспадаркі ў II квартале 1927-28 году.

На ўзмацненьне гаспадаркі вёскі будзе адпушчана 9.400.000 руб.

Белсельбанк на 2 квартал 27-28 г. зрабіў заяўку ў Цэнтральны Сельска-Гаспадарчы Банк на водпуск 4530.000 руб. на вытворчае крэдытаваньне сельскай гаспадаркі Беларусі.

Гэтая заяўка задаволена Цэнтр. С.-Г. Банкам па доўгатэрміновым крэдытаваньні ў сумме 2.260.000 руб. і па кароткатэрміновым у суме 1.045.000 руб.; агулам адпушчана 3.305.000 р. Такім чынам, атрымана меней на 1.225.000 руб.; у рахунак недахватнай сумы намячаецца вучот вэксалёў Белсельбанку на 1.000.000 руб. у Цэнтральным Сельска - Гаспадарчым Банку.

Апрача таго, у II-м квартале праз Цэнтральны С.-Г. Банк будзе атрымана з Дзяржбанку каля 300—400 тыс. руб. Такім чынам, вытворчы квартальны плян поўнасьцю пакрываецца сродкамі па заяўцы Белсельбанку.

Неабходна адзначыць, што ў 2-м квартале ўсе сродкі па вытворчым крэдытаваньні ідуць на фінансаваньне сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі. З гэтых крэдытаў будзе адпушчана калхозам доўгатэрміновага крэдыту 420.000 руб. і кароткатэрміновага—60.000 руб.; на крэдытаваньне савхозаў—810.000 руб., з якіх 630.000 руб. доўгатэрміновага крэдыту, на забясьпечаньне машынамі—500.000 руб.

Трэба сказаць, што па гэтых трох групах да сучаснага моманту ніколі не адпускалася паквартальна такія буйныя сумы, а таму задачай Наркамзему, Белсельсаюзу і акруговых органаў на мясцох зьяўляецца правільнае вытворчае скарыстоўваньне гэтых сродкаў, якія маюць выключна вытворча-каапэрацыйны характар.

У II-м квартале гэтага году разам з камэрцыйным крэдытаваньнем **Белсельбанк накіроўвае на крэдытаваньне сел. гаспадаркі 9.400.000 руб.**

Трэба адзначыць, што ў сувязі з загатоўкай насеньня да высеньняй пасяўной кампаніі і з перадачай Белсельбанку шэрагу клієнтуры, Беларускае аддзяленьне Дзяржбанку павялічвае ліміт Белсельбанку на 400.000 р., г. зн. даводзіць яго да 1.250.000 р.

Такім чынам, становішча з крэдытаваньнем сельскай гаспадаркі ў Беларусі можна лічыць здавальняючым. Усе залўкі, якія зьвязаны з загатоўкай насеньня да надыходзячай высеньняй пасяўной кампаніі, Белсельбанк здаволіць поўнасьцю.

В. З.

КІНО-ТЭАТР.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Чацьвер, 5-1 „Бакханкі", трагэдыя ў трох дзеях.

Пятніца, 6-1 „У мінулы час", народная трагэдыя ў 4 дзеях.

Субота, 7-1 „Каля тэрасы", ДРАМА Ў 4-х ДЗЕЯХ З ЧАСОЎ 1918 г.

Нядзеля, 8-1 „Цар Максімільян", драма ў трох дзеях з інтэрмэдыяй. Пачатак а 8 з палов. гадз.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА» — Сучасная драма „ЖЕНА" у 6 частках. Зьвыш праграмы—Рычард Талмэдж у камэдыі «Ловкие дельцы» у 6 часткі.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". — З аўторка, 3-га студзеня, новая загранічная пастаноўка „ГОЛУБАЯ КРОВЬ" Маст. драма ў 6 частках. АНОНС! Наступная пастаноўка—амэрыканск ібавяк «ВЕЧНАЯ БОРЬБА»

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — З аўторка 3 студзеня, „ВАША ЗНАКОМАЯ" Суч. бытавая драма ў 6 часткі.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". — З аўторка, 3 студзеня, 3-я апошняя серыя „КЛЕЙМО ПРЕСТУПЛЕНИЯ".)—(Кіно-раман у 8 частках.)—(

АГРОНОМИЧЕСКОЕ БЮРО

Московского Общества Сельского Хозяйства предлагает к сезону 1928 года СЕМЕНА: трав, огородные, цветочные и полевые испытанной всхожести и чистосортности.

Полный каталог бесплатно по требованию.

Адрес: Москва, Смоленский Бульвар, д. 8.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

Менскага Гарадзкога Савету

№ 34

31 сьнежня 1927 г.

Аб урачэбна-санітарным наглядзе за асобамі працуючымі ў харчавых прадпрыёмствах, лазьнях, цырульнях, пральнях і гасьцініцах.

У мэтах абароны насельніцтва ад пошасных захворваньняў, перадаваемых цераз харчавыя прадукты і іншыя прадметы асобамі, маючымі дачыненьне з гэткімі ў працэсе іх працы, Менскі Гарадзкі Савет **пастанаўляе:**

1. Абавязаць адміністрацыю дзяржаўных, грамадзкіх і ўласьнікаў прыватных харчавых прадпрыёмстваў, лазьняў, цырульняў, пральняў і гасьцініц, прыняўшы на службу асоб адразу накіроўваць іх для мэдыцынскага агляду, які робіцца за кошт прадпрыёмстваў.

2. Устанавіць штомесячны цялесны агляд Акруговай Інспэктурай Аховы Здароўя за к